культура у палоне мінулага

міждысцыплінарная навуковая канфэрэнцыя

пры падтрымцы Scholars for Belarus by akno e.V.

віленскі беларускі музэй імя івана луцкевіча

ВІЛЬНЯ, 11-13 ЧЭРВЕНЯ 2026

Культура ў палоне мінулага

Віленскі беларускі музэй імя І. Луцкевіча

11–13 чэрвеня 2025

Вітаем вас.

Сёлета спаўняецца 105 гадоў з заснаваньня Беларускага музэю імя Івана Луцкевіча ў Вільні і 145 гадоў з нараджэньня самога Івана Луцкевіча, аднаго з заснавальнікаў беларускай навукі (на гэтым жа тыдні, як адбываецца канфэрэнцыя). Сучаснай жа ітэрацыі Віленскага беларускага музэю сёлета споўнілася 25 гадоў. І гэта ўсё даты, якія варта і хочацца сьвяткаваць, але таксама яны клічуць спыніцца. Спыніцца і задумацца аб тым, што адбывалася з беларускай гісторыяй, культурай і спадчынай за гэтыя гады, і як яно паўплывала на тое, што ў гэтых прасторах адбываецца цяпер. ”Культура ў палоне мінулага” - аб гэтых думках, аб культавых фігурах і нябачных прывідах, якія фармуюць нашыя штодзённыя дзеяньні і бачаньне.

Таксама задумацца аб тым, як нашыя дзеяньні ўплываюць на час, калі мы самі станем культавымі прывідамі, нябачнымі зданямі ці чымсьці пасярэдзіне.

Гэта канфэрэнцыя - пра каноны, канешне, але насамрэч яна пра нас з вамі.

Зычым удзельнікам і слухачам натхнёнага і плённага мерапрыемства.

Паўліна Вітушчанка, Паўліна Скурко
арганізатаркі канфэрэнцыі

Змест

Вітаем вас. **iii**

Гэзісы **1**

Школьны навучальны курс па моўных правах – ірландскі прыклад і беларускія перспектывы (*Дзяніс Тушынскі*) 1

Захаванне беларускай культурнай ідэнтычнасці дзяцей у эміграцыі праз выкладанне Беларусазнаўства (*Вольга Пашковіч*) 2

“Медыякультура і нацыянальная свядомасьць у Беларусі: паміж палонам мінулага і культурай дэмакратыі” (*Тамара Мацкевіч*) 3

Трансфармацыя беларускага тэатральнага канону ў эміграцыі: сцэнічныя чытаньні і новыя формы драматургічнай рэпрэзентацыі (*Ксенія Князева*) 4

Беларусы ў люстэрку белліта: паміж канонам і самаўспрыманнем (*Марына Казлоўская*) 6

”Да пытаньня атрыбуцыі так званага ”кубка Сапегі” са скарбніцы Палаца вялікіх князёў у Вільні” (*Марына Сідаровіч*) 7

Нясвіжскі Катэхізіс Сымона Буднага 1562 г.: да пытання аб тэкстуальных і канцэптуальных запазычаннях з Вялікага Катэхізіса Марціна Лютэра 1529 г. (*Радзівон Колас*) 8

Традыцыя піваварэння ў беларускіх перасяленцаў-самаходаў у Заходняй Сібіры (*Паліна Кур’яновіч*) 9

Беларусь вачыма нямецкіх мастакоў падчас Першае сусьветнае вайны (1915-1918) (*Сяргей Харэйскі*) 10

Праблема фармавання і патрэбы рэвізіі канона ў нацыянальным гістарычным наратыве (*Аляксей Ластоўскі*) 10

”Публічная гісторыя як крыніца для стварэння беларускіх п’ес” (*Наталля Валанцэвіч*) 11

Алесь Адамовіч у палоне вайны: як дзяржаўны наратыў звужае памяць пра пісьменніка (*Андрэй Архіпенка*) 11

Правасуддзе і імперская інтэграцыя: супярэчнасці судова-прававой палітыкі Расійскай імперыі ў беларуска-літоўскіх губернях (канец XVIII — пачатак XX ст.) (*Ігар Гушчынскі*) 12

Сталінская архітэктура ў Беларусі: механізмы ідэалагічнага ўздзеяння, крытычная ацэнка і прынцыпы інтэрпрэтацыі (*Раман Забела*) 13

Выбар правапіснай кадыфікацыі, моўнага канону і культурнай арыентацыі: ці ёсьць узаемазалежнасьць (*Вінцук Вячорка*) 15

Што ўкраінцы ведаюць пра беларусаў? Супастаўленне нацыянальных гістарычных наратываў: ад Рагнеды да БССР (*Андрэй Скурко*) 16
Скразныя тэмы ўкраінскай культуры і іх трансфармацыя падчас вайны (*Ольга Петренко-Цеунова*) 17
«От героизации к мобилизации: Брестская крепость и авторитарная политика памяти в Беларуси» (*Наталья Зданевич*) 19
Адмоўная культура памяці: гвалтоўныя формы забыцця ад егіпецкіх фараонаў да беларускага2020-га. (*Яўген Красулін*) 20
Унікальнасць беларускага ”рухомага прагалу”, ці Гранічная патрэба патрабіць у палон мінулага (*К. П.*) 21
Што ёсць традыцыя і сучаснасць? Падарожжа ў магчымыя гісторыі беларускага тэатра (*Таня Арцімовіч*) 22
Траўма без кананізацыі: маўчанне як механізм трансгенерацыйнай перадачы ў беларускім кантэксце (*Кацярына Розіна*) 23
Беларуский материал в музее Яд Вашем: известное, неизвестное и недосказанное (*Яўген Розін*) 24
Сучасныя практыкі і падыходы ў выкарыстанні вуснагістарычных сведчанняў у экспазіцыях еўрапейскіх музеяў і інтэрнэт-праектах па тэме камуністычных рэпрэсіяў як аснова канцэпцыі абноўленага Віртуальнага музея савекіх рэпрэсіяў у Беларусі (*Валерыя Чарнаморцава*) 25
Беларускія музеі і трактоўка спадчыны як адлюстраванне савецкай культурнай перыферыі. Ці не варта пачаць дыскусію аб змене парадыгмы? (*Раман Крыщук*) 27
Музей Вялікай Айчыннай вайны БССР, савецкія ваеннапалонныя і канон «ўсенароднай партызанскай барацьбы» (1940–1980-я гг.) (*Яніна Карпенкіна*) 29
Посцілка - настальгія па прыгажосці: аб актуалізацыі сялянскай культурнай спадчыны. (*Вольга Лабачэйская*) 30
Беларуская традыцыйная культура: вынаходніцтва этнографаў XIX - XX ст., канструяванне актывістаў 1980-х гг. ці рэальнасць народнай практыкі вяскоовага насельніцтва (*Сцяпан Захаркевіч*) 31
Гендарны падыход у асучасьненьні канонаў беларускай культуры на прыкладзе зьявы ”бязкніжнага пісьменьніцтва”. (*Уладзіслаў Іваноў*) 31
Fashioning the Urban Tissue: City planning, garment design, and gender performance in Minsk (*Emma Louise Leahy*) 32
Джаз у Вільні 1920-30-х гг.: Тры колеры ”Штраляў” (*Віктар Сямашка*) . . . 33
“Партызанскі міф” Беларусі: на сутыку гісторыі, ідэалогіі і антрапалогіі (*Уладзімір Лобач*) 34
Актывісцкія практыкі як сродак стварэння гарадской спадчыны: графіці, перформансы, вулічныя фестывалі. (*Дар’я Буяла*) 35
Нефармальныя архівы Брэста: Visit Brest, Brest Herstory і новыя практыкі культурнай памяці (*Аліна Дзеравянка*) 36
kalyska.archive. сямейныя ўспаміны, як частка агульнай культуры памяці (*Сяргей Кавалёў*) 36
Электронны гід “Міжваенны татарскі маршрут па Вільні” (*Ангеліна Б., Андрэй Л.*) 37

Методология как беларусская theory of change: игра, отложенное будущее и практики настоящего (*Анастасия Сташкевич*) 38
Экалагічны дыскурс культурнай спадчыны (*Таццяна Кузняцова*) 40
Беларускі тэатр 2020-х гадоў у кантэксце трансфармацыі культурных канонаў: ад інстытуцыйнай крытыкі да блогерскага дыскурсу (*Настасся Панкратава*) 41
Музеефікацыя блізкай гісторыі – актуальныя практыкі і метадалагічныя выклікі (*Аляксей Бацюкоў*) 42
Ці састарэла спадчына? Так! (*Сцяпан Стурэйка*) 43
Upływu palityki na kanony biełaruskaj kultury u XX st. i na paczatku XXI st. (*Алена Глагойская*) 43

Імянны паказьнік **45**

Тэзісы

Школьны навучальны курс па моўных правах – ірландскі прыклад і беларукія перспектывы

ПАНЭЛЯ 1: КАНОНЫ Ў ВЫГНАННІ

Дзяніс Тушынскі

Незалежны даследчык

Аналізуецца распрацаваны ў Рэспубліцы Ірландыя курс па моўных правах для школьнікаў. Культурна-гістарычныя перадумовы стварэння і зместу курса разглядаюцца як перадумовы прававых механізмаў рэгуляцыі моўнай сітуацыі. Даклад раскрывае гісторыю развіцця моўнай суітуацыі ў краіне і праводзіць паралелі з адпаведнымі працэсамі ў Беларусі.

Праводзіцца параўнальны аналіз механізмаў прававой рэгуляцыі культурна-моўнай сферы ў Рэспубліцы Ірландыя і ў Беларусі, робяцца высновы аб магчымасцях пазычыння пэўных ірландскіх прававых механізмаў.

Падрабязна аналізуецца змест курса, распрацаванага Офісам моўнага камісара сумесна з “An Chomhairle um Oideachas Gaeltachta agus Gaelscolaíochta”, арганізацыяй, што займаецца пытаннямі гэламоўнай адукацыі як у Гэлтахтах, так і на ўсёй тэрыторыі краіны. Курс складаецца з васьмі ўрокаў:

1. Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека
2. Ідэнтычнасць, нацыянальнасць і культура
3. Важнасць авалодання мовамі
4. Шматмоўнасць
5. Ппаняцце моўных правоў
6. Знаёмства з працай Офіса моўнага камісара
7. Ірландская мова вакол нас
8. Падрыхтоўка да экзамена.

Аналізуюцца метадычныя матэрыялы курса, у прыватнасці, кніга для настаўніка. У прыватнасці, разглядаюцца метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі вучнёўскіх праектаў на тэмы:

- складанне хартыі моўных правоў класа;
- начычэнне школьнага асяроддзя ірландскай мовай;
- святкаванне Еўрапейскага дня моваў (26 верасня);
- складанне ірландамоўнага буклета для школьнай бібліятэкі;
- арганізацыя наведвання школы прадстаўніком офіса моўнага камісара.

У дакладзе даводзіцца важнасць распрацоўкі падобнага курса ў Беларусі ў будучыні. У прыватнасці, нягледзячы на афіцыйны білінгвізм і цяжкі стан беларускай мовы, адукацыйныя стандарты, канцэпцыі ці праграмы і г.д. ні па гамадазнаўчых прадметах, ні па дзяржаўных мовах і літаратурах ніяк не згадваюць моўныя правы, сацыяльныя і

псіхалагічныя аспекты білінгвізму ці што-небудзь падобнае, не кажучы ўжо пра праблемы беларускай мовы.

Прапануецца шэраг тэм, якія млжна будзе ўключыць у адпаведны беларускі курс.

• Моўная сітуацыя, моўная палітыка і моўныя правы ў краінах свету.

• “Усеагульная дэкларацыя моўных правоў”, якую можна параўнаць з айчынным заканадаўствам, вылучыць іх плюсы і мінусы.

• Гісторыя моўнай сітуацыі і моўнай палітыкі ў Беларусі.

• Беларуская мова і яе афіцыйны статус за межамі Беларусі. “Еўрапейская Хартыя рэгіянальных моваў ці моваў меншасцяў”.

• Мовы нацыянальных меншасцяў у Беларусі і мовы беларусаў у дыяспары.

• Моўнае заканадаўства.

• Праблемы ў сферы моўных правоў, выкарыстання беларускай мовы і моў меншасцяў.

• Шляхі выпраўлення сітуацыі ў сферы моўных правоў і выкарыстання беларускай мовы.

Прапануецца шэраг метадычных рашэнняў для курса.

Нарадзіўся ў Менску. Скончыў Менскі Дзяржаўны Лінгвістычны Ўніверсітэт. Лінгвіст, выкладчык англійскай, нямецкай, шведскай моваў. Магістр псіхалагічных навук. Працаваў у Інстытуце псіхалогіі БДПУ імя М. Танка, на факультэце Міжнародных адносінаў БДУ. Сябра зліквідаваных Таварыства Беларускай Мовы імя Ф. Скарыны і Беларускай Партыі Зялёных.

ПАНЭЛЯ 1: КАНОНЫ Ў ВЫГНАННІ

Захаванне беларускай культурнай ідэнтычнасці дзяцей у эміграцыі праз выкладанне Беларусазнаўства

Вольга Пашковіч

Незалежная даследчыца, педагог і культурная дзеячка ў сферы міжкультурнай адукацыі, міграцыі і сацыяльнай інтэграцыі.

Падзеі апошніх гадоў прывялі да маштабнай хвалі вымушанай эміграцыі беларусаў, значную частку якой складаюць сем’і з дзецьмі. У новых сацыяльных і культурных умовах асаблівую актуальнасць набываюць пытанні захавання нацыянальнай ідэнтычнасці, культурнай памяці і мовы ў асяроддзі дзяцей беларускай дыяспары. У сітуацыі эміграцыі адукацыя становіцца не толькі сродкам перадачы ведаў, але і важнай прасторай падтрымкі, адаптацыі і захавання сувязі з беларускай культурай.

Даклад прысвечаны ролі беларусазнаўства ў працы з дзецьмі і падлеткамі з досведам вымушанай эміграцыі. Асноўная ўвага будзе нададзена адукацыйным і культурным практыкам, якія дапамагаюць дзецям захоўваць пачуццё культурнай прыналежнасці ва ўмовах жыцця па-за межамі Беларусі. На прыкладзе досведу працы ў беларускіх адукацыйных і грамадскіх ініцыятывах у Польшчы будуць разгледжаны асноўныя выклікі, звязаныя з выкладаннем беларусазнаўства для дзяцей у эміграцыі, а таксама магчымасці выкарыстання культуры, гісторыі, мовы і элементаў нематэрыяльнай спадчыны як інструментаў інтэграцыі і псіхалагічнай падтрымкі.

Асобная ўвага будзе звернута на праблему адаптацыі дзяцей у новым адукацыйным і сацыяльным асяроддзі, а таксама на ролю міжкультурнай адукацыі ў фармаванні бяспечнай прасторы для дзяцей-мігрантаў. У дакладзе будзе разгледжана, як праз

вывучэнне беларускай культуры, гісторыі, традыцый і сімвалаў можна падтрымліваць культурную памяць і фармаваць у дзяцей устойлівае разуменне ўласнай ідэнтычнасці.

Прапанаванае даследаванне таксама закранае пытанне пераасэнсавання сучасных культурных канонаў у беларускай дыяспары і ролі адукацыйных ініцыятыў у іх перадачы новым пакаленням беларусаў у эміграцыі. Даклад грунтуецца на практычным досведзе працы з дзецьмі беларускай і ўкраінскай эміграцыі, удзеле ў адукацыйных і культурных праектах у Польшчы, а таксама на аналізе сучасных падыходаў у сферы міжкультурнай адукацыі і сацыяльнай адаптацыі дзяцей з міграцыйным досведам.

Працуе ў сферы культуры, адукацыі і грамадскіх ініцыятыў, з асаблівай увагай да працы з дзецьмі і моладдзю з досведам вымушанай эміграцыі. Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры па спецыяльнасці «турызм і гасціннасць», магістр у сферы кіравання турызмам і інавацыямі ў турыстычных праектах.

Пасля вымушанай эміграцыі ў Польшчу працягнула працу ў адукацыйных і культурных праектах для беларускіх і ўкраінскіх дзяцей. Працавала ў беларускіх адукацыйных ініцыятывах у Варшаве, а таксама ўдзельнічала ў дзейнасці грамадскіх арганізацый і праектаў падтрымкі мігрантаў. Асноўныя тэмы дзейнасці — міжкультурная адукацыя, адаптацыя дзяцей у эміграцыі, захаванне культурнай ідэнтычнасці і стварэнне бяспечнай адукацыйнай прасторы для дзяцей-мігрантаў.

З'яўляецца аўтаркай першага ў Беларусі турыстычнага даведніка «Пашпарт турыста», удзельніцай міжнародных навуковых канферэнцый і культурных ініцыятыў. У 2022 годзе атрымала Прэмію імя Abdulcadira Gabeire Farah у намінацыі «Inspiring for actions» за дзейнасць у інтарэсах мігрантаў. У 2024 годзе была намінаваная на званне «Чалавек года ў культуры» за актыўную дзейнасць у культурным жыцці Польшчы.

"Медыякультура і нацыянальная свядомасьць у Беларусі: паміж палонам мінулага і культурай дэмакратыі"

Тамара Мацкевіч

ТБШ

Сучасная беларуская медыякультура фармуецца на скрыжаванні некалькіх уплываў — савецкай спадчыны, дзяржаўнай культурнай палітыкі, досведу пратэстаў 2020 года, лічбавых медыя і новых адукацыйных практык. У гэтым кантэксце асаблівую ролю набываюць адукацыя і медыя як ключавыя інстытуты стварэння нацыянальных наратываў, калектыўнай памяці і грамадзянскай свядомасці.

Даклад ставіць пытанне: ці здольная сучасная беларуская медыякультура выйсці за межы траўматычнай залежнасці ад мінулага і прапанаваць вобраз будучыні? Ці, наадварот, культура памяці становіцца галоўным механізмам самавызначэння беларускага грамадства ва ўмовах палітычнай і культурнай нестабільнасці?

Даклад прысвечаны аналізу таго, як беларускія адукацыйныя і медыйныя асяроддзі ўдзельнічаюць у фарміраванні сучаснай нацыянальнай ідэнтычнасці і ўяўленняў пра дэмакратыю. Асноўная ўвага нададзена супрацьстаянню паміж афіцыйнымі дзяржаўнымі наратывамі, якія часта абапіраюцца на савецкія гістарычныя і культурныя

каноны, і альтэрнатыўнымі формамі перадачы ведаў, што ўзнікаюць у школе, незалежных медыя, адукацыйных і культурніцкіх ініцыятывах, а таксама ў праектах беларусаў у выгнанні. У гэтых практыках асаблівае месца займаюць тэмы мовы, гістарычнай памяці, правоў чалавека і дэмакратычных каштоўнасцей.

Даследаванне таксама закранае праблему «палону мінулага» — сітуацыі, калі нацыянальная культура і адукацыя працягваюць функцыянаваць праз рэпрадукцыю старых канонаў і траўматычных гістарычных сцэнарыяў. Аднак адначасова сучасная медыяпрастора стварае ўмовы для з'яўлення новых наратываў, арыентаваных не толькі на памяць пра мінулае, але і на фарміраванне ўяўлення пра будучыню дэмакратычнай Беларусі.

Даклад абапіраецца на падыходы media studies, метады крытычнага мыслення і кампетэнтнасную мадэль педагогікі, разглядаючы адукацыю і медыя як цэнтральныя механізмы фарміравання нацыянальнай свядомасці, культурнай суб'ектнасці і дэмакратычнай культуры ў сучасным беларускім грамадстве.

Нарадзілася 31 ліпеня 1964 года, 17 год працавала ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, займалася даследаваннямі ў галіне інтэгральнай оптаэлектронікі і нанаэлектронікі.

У сярэдзіне 90-х гадоў далучылася да грамадскага аб'яднання "Цэнтар Супольнасьць", дзе кіравала адукацыйным аддзелам. З 2008 г. намесніца старшыні Таварыства беларускай школы. Узначальвала групу распрацоўчыкаў кампетэнтнаснай мадэлі беларускага вучня на аснове агульнаеўрапейскіх стандартаў і рэкамендацый. Суаўтар канцэпцыі рэформы школьнай адукацыі Беларусі 2024 г.

Аўтар шматлікіх публікацый і метадычных дапаможнікаў, стваральніца і суаўтар дыстанцыйных курсаў «Актыўная ацэнка», «Медыяадукацыя» і іншых. Заснавальніца і рэдактар сайта nastaunik.info (цяпер nastaunik.eu) – незалежнага адукацыйнага рэсурсу, метадычнай бібліятэкі і адкрытай пляцоўкі для публікацый педагогаў.

ПАНЭЛЯ 1: КАНОНЫ Ў ВЫГНАННІ

Трансфармацыя беларускага тэатральнага канону ў эміграцыі: сцэнічныя чытаньні і новыя формы драматургічнай рэпрэзентацыі

Ксенія Князева

Еўрапейскі гуманітарны універсітэт

Пасля 2020 году беларускі тэатр апынуўся ў сітуацыі радыкальнай трансфармацыі, выкліканай палітычным гвалтам, вымушанай эміграцыяй значнай часткі культурных дзеячаў і разрывам з ранейшымі інстытуцыйнымі мадэлямі існавання. У гэтых умовах асаблівую ролю набылі новыя формы тэатральнай прысутнасьці, якія дазваляюць працягваць працу з сучаснай беларускай драматургіяй па-за межамі дзяржаўных сцэнаў і традыцыйных культурных інстытуцыяў. Адной з такіх формаў сталі сцэнічныя чытанні, што ў беларускай эміграцыйнай практыцы апошніх гадоў ператварыліся з дапаможнага або падрыхтоўчага жанру ў самастойны спосаб мастацкага выказваньня і культурнай рэпрэзэнтацыі.

Даклад прапануе разгляд сцэнічных чытанняў як формы трансфармацыі беларускага тэатральнага канону ва ўмовах эміграцыі ў 2020–2026 гадах. Асноўная ўвага

будзе нададзеная таму, якім чынам эміграцыйны тэатар пераасэнсоўвае саму катэгорыю тэатральнасці, змяняе адносіны паміж драматургічным тэкстам, выканаўцам і гледачом, а таксама выпрацоўвае новыя мадэлі культурнай памяці і супольнасьці.

Сцэнічныя чытанні ў беларускай эміграцыі функцыянуюць не толькі як эстэтычная практыка, але і як форма хуткай культурнай рэакцыі на палітычную і гістарычную траўму. Іх мабільны, нізкабюджэтны і адкрыты характар дазваляе пераносіць беларускую драматургію ў новыя кантэксты – ад незалежных тэатральных пляцовак да музеяў, бібліятэк, грамадзкіх прастораў і міжнародных фэстываляў. Такім чынам адбываецца перанос цэнтру тэатральнай легітымнасці з дзяржаўных інстытуцыяў у сферу гарызантальных культурных сувязяў і супольнасцяў эміграцыі.

У дакладзе будзе пастаўленае пытаньне пра тое, ці можна разглядаць сцэнічныя чытаньні як новую форму беларускага тэатральнага канону, што ўзнікае ў адказ на крызіс ранейшых мадэляў культурнай рэпрэзэнтацыі. Аналіз будзе грунтавацца на прыкладах беларускіх эміграцыйных тэатральных ініцыятываў і практык працы з сучаснай драматургіяй у Літве, Польшчы, Германіі.

Таксама прапануецца разгляд сцэнічных чытанняў як прамежкавай формы паміж архівам і жывым тэатральным актам: з аднаго боку, яны фіксуюць і захоўваюць досвед часу, а з другога – ствараюць прастору для калектыўнага перажывання і пераасэнсавання сучаснай беларускай гісторыі. У гэтым кантэксце беларускі эміграцыйны тэатр выступае не толькі як мастацкая з'ява, але і як асяродзе фармавання новых культурных канонаў, якія ўзнікаюць у стане разрыву з мінулым і адначасова ў сталым дыялогу з ім.

Тэатразнайца, кандыдатка мастацтвазнайства, дацэнтка.

Скончыла Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў па спецыяльнасці тэатразнайства, пазней – магістратуру і аспірантуру пры ёй. У 2015 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю па тэме «Сцэнаграфічнае мастацтва Беларусі на мяжы XX – XXI стагоддзяў». У 2018 г. прысвоена вучонае званне дацэнта. З 2009 па 2021 год выкладала на кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. З 2022 года па цяперашні час з'яўляюся выкладчыцай і куратаркай праграмы «Тэатральнае мастацтва і акцёрская ігра» ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце (г. Вільнюс, Літва). Апублікавала больш за 80 работ, куды ўваходзяць навуковыя і навукова-публіцыстычныя артыкулы, а таксама вучэбна-метадычныя дапаможнікі. Кола навуковых інтарэсаў: нацыянальная беларуская і еўрапейская тэатральная культура.

ЛЕКЦЫЯ

Беларусы ў люстэрку белліта: паміж канонам і самаўспрыманнем

Марына Казлоўская

Адукацыйны хаб "Нацыя Лідараў"

Выступ прысвечаны аналізу беларускага літаратурнага канону, які фарміруецца праз школьную праграму па літаратуры і выконвае не толькі адукацыйную, але і ідэалагічную функцыю, уплываючы на працэсы канструявання нацыянальнай ідэнтычнасці.

Школьны літаратурны канон, створаны ананімнымі аўтарамі адукацыйных праграм, разглядаецца як механізм сімвалічнай улады, праз які адбываецца нармалізацыя пэўных уяўленняў пра «тыповага» беларуса, яго гістарычны лёс, культурныя каштоўнасці і месца ў свеце.

У выступе аналізуецца, які вобраз беларусаў і беларусак прапануецца школьнай праграмай і якія мадэлі паводзінаў, эмацыйныя рэгістры і формы самаўспрымання яна замацоўвае. Асобна разглядаюцца аўтастэрэатыпы, што транслююцца праз корпус «абавязковых» тэкстаў: уяўленні пра беларусаў як пра цярплівую, пакорлівую, траўмаваную супольнасць, схільную да ахвярнасці, маральнага самаўтаймавання і настальгічнага ўспрымання мінулага. Аналізуецца таксама эстэтычнае напаўненне школьнага канону, у якім пераважаюць катэгорыі пакуты, страты, маральнага абавязку і вясковай аўтэнтычнасці, тады як урбаністычныя, посткаланіяльныя, фемінісцкія і эксперыментальныя перспектывы часта застаюцца без увагі.

Даклад ставіць пытанне пра магчымасць фарміравання альтэрнатыўнага беларускага літаратурнага канону, заснаванага на прынцыпах множнасці досведаў, адкрытасці да канфліктных інтэрпрэтацый і ўключэння раней выключаных галасоў. У гэтым кантэксце а як прастора фарміравання ўяўленняў пра тое, што лічыцца беларускім досведам і якім чынам беларускае грамадства ўяўляе сябе ў мінулым, цяперашнасці і будучыні.

Кандыдатка філалагічных навук, літаратуразнаўца, рэдактарка, выпускніца філалагічнага факультэта БДУ. З 2005 па 2022 гг. - настаўніца беларускай мовы і літаратуры Ліцэя БДУ, з 2016 па 2022 гг. - загадчыца кафедры беларускай мовы і літаратуры Ліцэя БДУ, з 2020 па 2022 гг. - намесніца дырэктара Ліцэя БДУ па вучэбнай рабоце. З лістапада 2022 года жыву ў Варшаве. Супрацоўнічаю з незалежнымі беларускімі выдавецтвамі як рэдактарка, працую ў якасці метадысткі ў адукацыйным хабе "Нацыя Лідараў".Суаўтарка літаратурнага падкаста "Спіс на лета". З 2023 года - каардынатарка варшаўскай праграмы фестывалю інтэлектальнай кнігі "Прадмова".

”Да пытаньня атрыбуцыі так званага ”кубка Сапегі” са скарбніцы Палаца вялікіх князёў у Вільні”

Марына Сідаровіч

ЕГУ

Даклад прапануе пераасэнсаваньне так званага «кубка Сапегі» – пазалочанага срэбнага кубка 1560 г., які сёньня захоўваецца ў Палацы вялікіх князёў літоўскіх у Вільні, – як прыкладу канструяваньня культурнага канону праз узаемадзеяньне арт-рынку, музэйнай практыкі і нацыянальных наратываў. Замест традыцыйнага разгляду прадмета як «магнацкай рэліквіі» дасьледаваньне канцэнтруецца на нестабільнасьці яго атрыбуцыі, праблемах расшыфроўкі надпісу і камэрцыйнай біяграфіі аб’екта ў XX–XXI стст.

Асноўная ўвага надаецца кірылічнаму надпісу на кубку, які доўгі час інтэрпрэтаваўся аўкцыённымі дамамі Sotheby’s і Christie’s у сувязі з родам Сапегаў. Аднак аналіз мовы надпісу паказвае, што ён значна бліжэйшы да жывой старабеларускай пісьмовай традыцыі XVI ст., чым да царкоўнаславянскай мовы, як сьцьвярджалася ў шэрагу каталёгаў. Асаблівую праблему ствараюць словы «подружіе его Тодосія», што сьведчыць хутчэй пра сямейны або шлюбны кантэкст прадмета, чым пра магнацкую дзяржаўную рэпрэзэнтацыю. Дадатковыя сумневы выклікае і слова «Оръшик», якое магло быць не тапонімам («з Оршы»), а прозьвішчам уладальніка.

У дакладзе прасочваецца, як у XX ст. кубак быў уключаны ў калекцыю Яўгена Любовіча – антыквара і ўдзельніка транснацыянальных гандлёвых сетак пасьлярэвалюцыйнага пэрыяду. Асобна разглядаецца роля Любовіча ў стварэньні катэгорыі «рускага срэбра» праз міжнародныя выставы 1930-х гадоў, дзе прадметы рознага паходжаньня і функцыі аб’ядноўваліся ў адзін камэрцыйна выгадны культурны наратыў. Такім чынам, кубак Вялікага Княства Літоўскага паступова ператвараўся ў частку больш шырокага рынку «славянскай раскошы».

Асобны пласт дасьледаваньня зьвязаны з нечаканымі сувязямі паміж Любовічам, французскімі каляніяльнымі золатаздабыўнымі кампаніямі ў Афрыцы і сям’ёй Ortiz Linares, нашчадкі якой у 2008 г. перадалі кубак Літве за сымбалічны адзін літ. Гэты эпізод разглядаецца як фінальны этап трансфармацыі аб’екта: ад сямейнага падарунка XVI ст. праз аўкцыённы лот і музэйны экспанат – да нацыянальнай рэліквіі.

Дасьледаваньне паказвае, што культурны канон часта грунтуецца не на стабільнай гістарычнай праўдзе, а на пасьлядоўным наслойваньні інтэрпрэтацый, камэрцыйных інтарэсаў і сымбалічных жаданьняў грамадзтва.

Нарадзілася ў 1966 годзе ў Менску. Закончыла філфак БДУ па спэцыяльнасьці «Беларуская і руская мова і літаратура». Закончыла асьпірантуру Нацыянальнай акадэміі навук па спэцыяльнасьці «Беларуская мова». Працавала ў выдавецтве «Універсітэцкае», газэтах «Царкоўнае слова» і «Звязда», музэі Максіма Багдановіча і Інстытуце праблем культуры, у незалежных СМІ. З 2021 года жыву ў Вільні. У 2025 паступіла ў магістратуру па спэцыяльнасьці «Канцэптуальны дызайн і сучаснае мастацтва» ЭГУ.

ПАНЭЛЯ 2. КАНОНЫ І КАНТАКТЫ

Нясвіжскі Катэхізіс Сымона Буднага 1562 г.: да пытання аб тэкстуальных і канцэптуальных запазычаннях з Вялікага Катэхізіса Марціна Лютэра 1529 г.

Радзівон Колас

Варшаўскі ўніверсітэт, Факультэт прыкладной лінгвістыцы, Інстытут інтэркультурных даследаванняў Сярэдня-Усходняй Еўропы

Нясвіжскі Катэхізіс 1562 года займае ў нацыянальнай беларускай гістарыяграфіі выключнае месца, супастаўнае з выданнямі Францыска Скарыны 1517–1525 гадоў, якія традыцыйна лічацца падмуркам айчыннага кнігадрукавання. Аднак вакол гэтага знакавага твора Сымона Буднага сфарміраваўся пласт дылетанцкіх меркаванняў і нацыянальных міфалагем, якія істотна ўскладняюць аб'ектыўную навуковую рэцэпцыю помніка. Выданне, якое пабачыла свет пад патранажам Мікалая Радзівіла Чорнага, трывала замацавалася ў дыскурсе як «народнае» і «самабытнае» з'явішча, што не заўсёды карэлюе з вынікамі сучасных архіўных і тэксталагічных пошукаў. Дадзены даклад прысвечаны крытычнаму пераасэнсаванню ўкаранёных наратываў, якія не маюць належнага факталагічнага падмацавання ў беларускім гістарычным полі. Метадалогія даследавання грунтуецца на прымяненні комплекснага гісторыка-генетычнага і кампаратыўна-тэксталагічнага аналізу. Асноўная ўвага надаецца дэканструкцыі тэксту Катэхізіса праз параўнанне яго структуры, тэрміналогіі і аргументацыі з першакрыніцамі еўрапейскай Рэфармацыі. Выкарыстоўваецца метад кантэкстуальнага аналізу для рэканструкцыі інтэлектуальнага профілю аўтара і выяўлення яго сувязей з заходнееўрапейскімі багаслоўскімі цэнтрамі. У межах працы вырашаюцца наступныя задачы:

1. Правесці дэталёвае тэксталагічнае параўнанне Нясвіжскага Катэхізіса з працамі Марціна Лютэра і іншых рэфарматараў для выяўлення канкрэтных крыніц запазычанняў.

2. Выявіць і сістэматызаваць асноўныя гістарыяграфічныя міфы, датычныя «абсалютнай арыгінальнасці» і выключна «народнага» характару мовы і зместу выдання.

3. Рэканструяваць механізмы трансферу ідэй перыяду агульнаеўрапейскай Рэфармацыі ў культурную прастору Вялікага Княства Літоўскага праз дзейнасць Сымона Буднага.

Асноўныя высновы даследавання дазваляюць сцвярджаць, што Нясвіжскі Катэхізіс з'яўляецца вынікам складанага сінтэзу еўрапейскай багаслоўскай думкі і мясцовай моўнай традыцыі. Аўтарам выяўлена больш за дзесяць прамых запазычанняў Будным лютэраўскіх фабул, а таксама шэраг канцэптуальных рэцэпцый у пабудове сістэмы аргументацыі і экзегетычным тлумачэнні святых тэкстаў. Гэтыя дадзеныя не прымяншаюць значнасці працы Буднага, але кардынальна змяняюць яго навуковы статус: ён паўстае не як «плагіятар» ці «копііст», а як высокаадукаваны інтэлектуал-пасрэднік, здольны адаптаваць складаныя багаслоўскія канцэпцыі да лакальнага кантэксту.

Крытычны падход даследавання дазваляе аднавіць сапраўдны інтэлектуальны партрэт Сымона Буднага як палеміста і перакладчыка, падкрэсліваючы глыбокую інтэграванасць Вялікага Княства Літоўскага ў агульнаеўрапейскія гістарычныя і культурныя працэсы XVI стагоддзя. Гэта дазваляе адысці ад правінцыйнага ізаляцыянізму ў ацэнцы помніка і ўпісаць яго ў глабальны кантэкст гісторыі ідэй.

2020–2025 гг. — Бакалаўрыят і магістратура гістарычнага факультэту БДУ (дыплом з адзнакай);

2021–2025 гг. — навуковы супрацоўнік НАН Беларусі (Цэнтр даследавання старадрукаванных выданняў і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі, Цэнтр даследавання беларускай мовы, культуры і літаратуры);

з 2025 г. — магістрант Варшаўскаага ўніверсітэта (UW, WLS, ISIEŚW), Стыпендыят Праграмы імя Кастуся Каліноўскага, сябра Навуковай Рады KLIN пры ISIEŚW.

Аўтар звыш 60 навуковых артыкулаў і публікацый у галіне лацінскай і кірылічнай палеаграфіі, а таксама культурнай антрапалогіі.

Традыцыя піваварэння ў беларускіх перасяленцаў-самаходаў у Заходняй Сібіры

Паліна Кур'яновіч

Незалежная даследчыца

Выступ прысвечаны даследаванню і гісторыка-культурнаму асэнсаванню асаблівасцей, а таксама перспектыў захавання традыцыі хатняга піваварэння ў асяродку беларускіх перасяленцаў-самаходаў, якія жывуць у Заходняй Сібіры (Арамашэўскі і Вікулаўскі раёны Цюменскай вобласці РФ). Эмпірычную базу працы склалі палявыя матэрыялы, сабраныя падчас сумеснай расійска-беларускай фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ў кастрычніку 2014 году ў вёсцы Новабярозаўка, Ермакі і Ялаўка. У ходзе даследавання быў праведзены аналіз лаканічны працэсаў міграцыі беларускага сялянства (пераважна з усходніх губерняў, у прыватнасці Магілёўскай) у другой палове XX стагоддзя пад уплывам дзяржаўных рэформ. Разглядаецца спецыфіка рассялення і фактары захавання этнакультурнай аўтаномнага суполак у сібірскім асяроддзі праз светапоглядную апазіцыю "свой-чужы", якая спрыяла ўзмацненню іх этнічнай самаідэнтыфікацыі і кансервацыі элементаў матэрыяльнай і духоўнай культуры, уключаючы дыялектныя асаблівасці мовы. Увага надаецца нацыянальнай кулінарыі і броварству як важны этнічны маркер. У артыкуле падрабязна апісваецца зафіксаваны ад старэйшых жанчын-носьбітаў аўтэнтычны рэцэпт прыгатавання традыцыйнага самаходскага жытняга піва. Прасочваецца выразная гендарнай спецыфіка гэтай традыцыі, дзе веды і навыкі перадаюцца строга па жаночай лініі. У тэксце прыводзіцца глыбокае параўнанне старога і сучаснага трансфармаванага спосабу піваварэння, якія адаптаваныя пад сучасныя побытавыя ўмовы з выкарыстанннем пакупных інгрэдыентаў. Таксама разглядаецца рытуальная роля гэтага напою ў кантэксце захаванага сібірскімі беларусамі каляндарнага абраду пераносу "Свячы".

Скончыла БДУКіМ кафедры этналогіі і фальклору, магістратура ва Універсітэце НАН Беларусі спецыяльнасць мастацтвазнаўства.

ПАНЭЛЯ 2. КАНОНЫ І КАНТАКТЫ

Беларусь вачыма нямецкіх мастакоў падчас Першае сусьветнае вайны (1915-1918)

Сяргей Харэўскі
ЕГУ

Падчас Першае сусьветнае вайны ў Беларусі служылі дзясяткі нямецкіх мастакоў, у тым ліку і вядомых да вайны, выпускнікоў і выкладчыкаў мастацкіх акадэміяў. Тысячы іх твораў былі рэпрадукаваныя ў прэсе і на паштоўках, якія таксама сталі дакумантамі таго часу. Апроч мастацкай вартасці тыя творы маюць вялікую дакумэнтальную каштоўнасць і для этнографаў, і дасьледчыкаў архітэктуры, для краязнаўцаў.

Вучыўся ў школе з мастацкім ухілам №26, у Менскай мастацкай вучэльні імя А. Глебава (1982—1987); у Інстытуце жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І. Рэпіна Акадэміі мастацтваў СССР (1988—1992), асьпірантуры Беларускай акадэміі мастацтваў (1994—1997), у 1996 у летняй школе Варшаўскага ўнівэрсытэту.

Цяпер выкладае ў Эўрапейскім гуманітарным унівэрсытэце (Вільня).

ПАНЭЛЯ 3. ПРЫВАТНАЕ, ПУБЛІЧНАЕ, ДЗЯРЖАЎНАЕ

Праблема фармавання і патрэбы рэвізіі канона ў нацыянальным гістарычным наратыве

Аляксей Ластоўскі
Беларускі інстытут публічнай гісторыі

Беларускі нацыянальны гістарычны наратыў сфармаваўся на мяжы XIX-XX стагоддзяў у працах Вацлава Ластоўскага і Мітрафана Доўнар-Запольскага. У адпаведнасці з патрэбамі нацыянальнага будаўніцтва, беларуская гістарычная свядомасць фармавалася на міфах Залатога века сярэднявечча і ў жорсткай апазіцыі да расійскага і польскага імперскага праекта. Цэнтральнай часткай гэтага наратыву стаў канон гістарычных постацей, якія абвяшчаліся беларусамі, з якіх ствараласа мадэль гістарычнага мінулага. Фактычна гэты канон з пачатку XX стагоддзя перабраўся нязменным у пачатак XXI стагоддзя, з адзіным дабаўленнем польскамоўнай культуры 18-19 стагоддзяў (дзякуючы намаганням пераважна Адама Мальдзіса).

Разам з тым, відавочна, што такі канон ужо не адпавядае сучасным выклікам для беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці, паколькі ён будуецца на этнацэнтрызме і прымусовай “беларусізацыі” ключавых постацей насуперак гістарызму. Ужо няма патрэбы ствараць з беларускіх сялян нацыю, нацыя ўжо ёсць і яна мусіць знайсці сваё месца ў сучасным свеце. На маю думку, патрэбны перагляд канону гістарычных дзеячоў на новых прынцыпах: 1) полікультурнасці, дзе беларуская гісторыя абсарбіруе ў сябе мноства магчымых культурных ідэнтычнасцей; 2) адкрытасці, 3) адмовы ад “перапісвання” ідэнтычнасцей, уважлівасці да зробленых выбараў. Фактычна мова ідзе пра стварэнне гістарычнага канону грамадзянскай нацыі, якая абапіраецца на традыцыю шматвекавога суіснавання розных моўных, рэлігійных і этнічных супольнасцей на беларускай зямлі.

Кандыдат сацыялагічных навук, акадэмічны дырэктар Беларускага інстытута публічнай гісторыі, даследчык Інстытута “Палітычная сфера”, выкладчык Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэт (Літва).

”Публічная гісторыя як крыніца для стварэння беларускіх п’ес”

ПАНЭЛЯ 3. ПРЫВАТНАЕ, ПУБЛІЧНАЕ, ДЗЯРЖАЎНАЕ

Наталля Валанцэвіч

Незалежная даследчыца

У дакладзе даследуецца феномен публічнай гісторыі як рэсурс для сучаснай беларускай драматургіі. У часы, калі ў грамадстве ідзе пошук новых маркераў ідэнтычнасці, аўтары і аўтаркі п’ес актыўна выкарыстоўваюць розныя гістарычныя крыніцы — ад хронік, архіўных дакументаў і вусных сведчанняў да лічбавых баз дадзеных. У выніку тэатр не проста рэканструюе падзеі мінулага, але стварае прастору для крытычнай рэфлексіі, дыялогу і актуалізацыі гістарычнай памяці. Часта драматургі і драматургіні супастаўляюць факты мінулага з трыгернымі падзеямі сучаснасці. Параўноўваючы розныя эпохі і падсвятляючы іх паралелі, аўтары і аўтаркі дапамагаюць публіцы асэнсаваць сённяшнія рэаліі праз прызму мінулых часоў, а таксама знайсці шляхі для пераадолення калектыўных траўмаў.

Алесь Адамовіч у палоне вайны: як дзяржаўны наратыў звужае памяць пра пісьменніка

ПАНЭЛЯ 3. ПРЫВАТНАЕ, ПУБЛІЧНАЕ, ДЗЯРЖАЎНАЕ

Андрэй Архіпенка

Ініцыятыўная группа прыпынак Адамавіча, гісторык, магістр палітычных навук

Алесь Адамовіч займае асаблівае месца ў беларускай культуры і літаратуры XX стагоддзя як пісьменнік, публіцыст, сцэнарыст, грамадскі дзеяч і адзін з найбольш значных маральных галасоў беларускай інтэлігенцыі. Ягоная творчасць часткова сапраўды непарыўна звязаная з тэмай Другой сусветнай вайны, досведам акупацыі, Хатыні, спаленых вёсак, сведчаннямі ахвяраў і праблемай чалавечай адказнасці перад памяццю. Аднак у сучаснай беларускай дзяржаўнай і каляафіцыйнай прасторы памяць пра Адамовіча часта звужаецца амаль выключна да вобразу “пісьменніка пра вайну і партызанаў”. Такая кананізацыя робіць яго постаць зручнай для афіцыйнага гістарычнага наратыву, але адначасова выціскае з публічнай памяці больш складаныя і нязручныя вымярэнні ягонай спадчыны.

У дакладзе будзе разгледжана, як дзяржаўны наратыў выкарыстоўвае спадчыну Адамовіча ў межах ваеннага канону, падкрэсліваючы тэмы нямецкай акупацыі, антыфашысцкай памяці, але значна менш звяртаючы ўвагу на ягоны гуманізм, антываенную пазіцыю, крытыку гвалту, маральнай абыякавасці, дзяржаўнай хлусні і адказнасці інтэлектуала перад грамадствам. Выключэнне тэмы Чарнобыля і яго грамадскай дзейнасці як звязанныя элементы з пісьменнікам. Асаблівая ўвага будзе нададзена таму, што Адамовіч не проста захоўваў памяць пра вайну, але і праблематызаваў самі спосабы яе апісання, паказваючы вайну не як зручны гераічны міф, а як прастору траўмы, віны, сведчання і этычнага выбару.

Даклад прапануе разглядаць Адамовіча не толькі як частку савецкага і постсавецкага ваеннага канону, але і як аўтара, які гэты канон у многім падважваў. Ягоная дакументальная проза, публіцыстыка і грамадская дзейнасць дазваляюць убачыць у ім

фігуру значна шырэйшую за афіцыйны вобраз “ваеннага пісьменніка”: гэта мысляр, для якога памяць была не інструментам дзяржаўнай легітымацыі, а формай маральнай адказнасці перад ахвярамі і будучыняй.

Асобна будзе закранута праблема сучаснага ўшанавання Адамовіча: мемарыялізацыя, публічныя дыскусіі і лічбавыя праекты. У гэтым кантэксце паўстае пытанне: ці здольная беларуская культура памяці вярнуць Адамовічу паўнату ягонай спадчыны — літаратурнай, грамадзянскай, антываеннай, гуманістычнай і крытычнай?

Такім чынам, даклад будзе прысвечаны не толькі праблеме памяці пра аднаго пісьменніка, але і больш шырокаму пытанню пра тое, як культурныя каноны адначасова захоўваюць і абмяжоўваюць памяць. Выпадак Алеся Адамовіча дазваляе паказаць, як дзяржаўны наратыў можа ператвараць складаную інтэлектуальную постаць у зручны сімвал, і чаму сёння важна вяртаць у публічную прастору не толькі “кананічнага”, але і жывога, нязручнага, этычна патрабавальнага Адамовіча.

ПАНЭЛЯ 3. ПРЫВАТНАЕ, ПУБЛІЧНАЕ, ДЗЯРЖАЎНАЕ

Правасуддзе і імперская інтэграцыя: супярэчнасці судова-прававой палітыкі Расійскай імперыі ў беларуска-літоўскіх губернях (канец XVIII — пачатак XX ст.)

Ігар Гушчынскі
Варшаўскі ўніверсітэт

На працягу ўсяго перыяду знаходжання ў складзе Расійскай імперыі зямель, далучаных у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай, адной з ключавых мэтаў дзяржаўнай палітыкі заставалася іх інтэграцыя ў агульнаімперскую палітыка-адміністрацыйную, прававую і культурную прастору. Змяняліся інтэнсіўнасць гэтай палітыкі, яе інструменты і ідэалагічнае абгрунтаванне, аднак сфера правасуддзя нязменна займала ў гэтых працэсах істотнае месца. Судовыя ўстановы не толькі забяспечвалі прымяненне права, але і выступалі прасторай узаемадзеяння імперскай улады з мясцовым грамадствам. У дакладзе эвалюцыя судова-прававой палітыкі Расійскай імперыі ў беларуска-літоўскіх губернях разглядаецца не проста як паслядоўнасць рэформ і адміністрацыйных пераўтварэнняў судовай сістэмы, а як частка складанага працэсу ўзаемадзеяння і сутыкнення ўлады з мясцовым грамадствам, а таксама паступовага пераазначэння межаў мясцовай прававой адметнасці краю. Даследаванне грунтуецца не толькі на матэрыялах заканадаўчых актаў, але і на шырокім коле архіўных крыніц з архіваў Беларусі, Літвы і Расіі, значная частка якіх упершыню ўводзіцца ў навуковы зварот. Асноўная выснова даклада заключаецца ў тым, што гістарычныя і палітычныя асаблівасці краю ўсталёўвалі пэўныя межы імперскай уніфікацыі ў судова-прававой сферы. Першапачаткова расійская ўлада была вымушана ўлічваць трываласць мясцовай прававой традыцыі, заснаванай на Статуце ВКЛ 1588 г., а таксама ўстойлівых судовых практык, якія прадугледжвалі элементы спаборнасці, галоснасці і адноснай незалежнасці суда. Гэтыя рысы ўскладнялі ўкараненне інквізіцыйнай і адміністрацыйна арыентаванай мадэлі расійскага правасуддзя. Аднак пасля паўстання 1830–1831 гг. курс на ўніфікацыю краю з унутранымі губернямі імперыі ўзмацніўся. Было скасавана дзеянне Статута ВКЛ і ўкаранёна расійская мадэль судаўладкавання. Аднак гэта не азначала знікнення рэгіянальнай спецыфікі з імперскай судова-прававой палітыкі. Палітычная нестабільнасць, наступствы паўстанняў і недавер расійскіх улад да мясцовага грамадства

абумоўлівалі выняткі з агульнаімперскага заканадаўства, накіраваных на ўзмацненне адміністрацыйнага кантролю, у тым ліку над судовай сістэмай. Асабліва выразна гэта выявілася падчас правядзення ліберальнай судовай рэформы 1864 г., рэалізацыя якой у заходніх губернях суправаджалася істотнымі выключэннямі і спробамі звязаць мадэрнізацыйныя пераўтварэнні ў сферы правасуддзя з агульнай палітычнай стратэгіяй русіфікацыі рэгіёна. Разгляд эвалюцыі правасуддзя ў даследаваны перыяд у такой перспектыве дае магчымасць дакладней зразумець механізмы расійскага імперскага кіравання рэгіёнам, межы ўніфікацыйнай палітыкі, а таксама гістарычныя вытокі і ўмовы трансфармацыі прававой культуры беларускага грамадства.

Ігар Гушчынскі (нар. 1984) — гісторык, які спецыялізуецца на гісторыі судовай сістэмы, прававой культуры і імперскага кіравання ў заходніх губернях Расійскай імперыі ў канцы XVIII — пачатку XX ст. Выпускнік гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка (2006), кандыдат гістарычных навук (2011). У 2010–2024 гг. працаваў у сферы вышэйшай адукацыі ў Беларусі, у тым ліку дацэнтам і намеснікам дэкана па вучэбнай рабоце ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка, а таксама дэканам факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі ў БІП — Універсітэце права і сацыяльна-інфармацыйных тэхналогій. З 2024 г. — афіліяваны даследчык факультэта гісторыі Варшайскага ўніверсітэта. У межах праграмы EU4Belarus — SALT II рэалізуе праект «Эвалюцыя судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі (1772–1917)». Аўтар 75 навуковых публікацый. ORCID: https://orcid.org/0000-0001-6866-7723

Сталінская архітэктура ў Беларусі: механізмы ідэалагічнага ўздзеяння, крытычная ацэнка і прынцыпы інтэрпрэтацыі

ПАНЭЛЯ 3.ПРЫВАТНАЕ, ПУБЛІЧНАЕ, ДЗЯРЖАЎНАЕ

Раман Забела

Незалежны даследчык

Даследаванне прысвечана аналізу сталінскай архітэктуры ў Беларусі як формы дзяржаўнай ідэалагічнай камунікацыі, інтэграванай у архітэктурную і горадабудаўнічую структуру савецкага перыяду. У працы сталінская архітэктура разглядаецца не толькі як мастацкая або стылістычная з'ява, але як частка дзяржаўнай сістэмы прасторавай арганізацыі, накіраванай на рэпрэзентацыю палітычнай улады, трансфармацыю гістарычнага асяроддзя і фарміраванне новых мадэляў калектыўнай ідэнтычнасці.

Актуальнасць даследавання абумоўлена асаблівасцю беларускага кантэксту, у якім савецкая архітэктурная спадчына працягвае ўспрымацца пераважна як натуральны элемент нацыянальнага гарадскога асяроддзя і амаль не аналізуецца ў сувязі з механізмамі дзяржаўнай прапаганды, саветызацыі прасторы і таталітарнай палітыкай памяці. У адрозненне ад краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, дзе пасля распаду сацыялістычных рэжымаў адбыліся працэсы дэкамунізацыі і крытычнага пераасэнсавання савецкай архітэктурнай спадчыны, у Беларусі падобная дыскусія не атрымала сістэмнага развіцця ні ў прафесійным асяроддзі, ні ў практыцы аховы спадчыны.

Мэтай даследавання з'яўляецца крытычны аналіз сталінскай архітэктуры ў Беларусі як формы дзяржаўнай ідэалагічнай камунікацыі, а таксама распрацоўка прынцыпаў яе ацэнкі, інтэрпрэтацыі і захавання ў кантэксце працы са "складанай спадчынай"

(difficult heritage). Для дасягнення гэтай мэты даследуюцца гістарычныя ўмовы фарміравання сталінскай архітэктурнай дактрыны, асаблівасці яе развіцця ў БССР, а таксама сістэматызуюцца механізмы ідэалагічнага ўздзеяння, інтэграваныя ў архітэктурную і горадабудаўнічую структуру. Паказваецца, што асноўныя прынцыпы савецкай прасторавай мадэлі былі сфарміраваныя ў агульнасаюзных цэнтрах і ў значнай ступені перанесены ў БССР праз дзейнасць маскоўскіх і ленінградскіх архітэктурных школ. Разглядаецца праблема разрыву гістарычнай пераемнасці, трансфармацыя гістарычнай структуры гарадоў і фарміраванне новых савецкіх сімвалічных цэнтраў. Аналізуецца абмежаваны і кантраляваны характар нацыянальнага складніка ў межах афіцыйнага савецкага архітэктурнага канону. Асобная ўвага ў даследаванні надаецца праблеме тэрміналогіі, якая выкарыстоўваецца для апісання архітэктуры сталінскага перыяду. Праблема тэрміналогіі разглядаецца як частка больш шырокага пытання аб метадах крытычнай інтэрпрэтацыі савецкай архітэктуры. Аналізуецца ўплыў тэрмінаў на інтэрпрэтацыю дадзенай спадчыны, ступень яе эстэтызацыі або палітычнай нейтралізацыі.

Адным з асноўных вынікаў даследавання становіцца сістэматызацыя прамых і ўскосных механізмаў ідэалагічнай камунікацыі ў сталінскай архітэктуры. Прапанаваная сістэма можа выкарыстоўвацца як даследчы інструмент пры гісторыка-архітэктурным аналізе, ацэнцы каштоўнасці аб'ектаў і распрацоўцы канцэпцый іх захавання.

У даследаванні абгрунтоўваецца неабходнасць разглядаць сталінскую архітэктуру ў Беларусі як спецыфічную катэгорыю складанай спадчыны, якая патрабуе не толькі аховы матэрыяльнай структуры, але і крытычнай інтэрпрэтацыі яе гістарычнага і ідэалагічнага кантэксту.

У выніку даследавання сістэматызаваны механізмы ідэалагічнай камунікацыі, інтэграваныя ў сталінскую архітэктуру Беларусі, вызначана спецыфіка беларускага кантэксту яе развіцця і сучаснага ўспрымання, абгрунтавана неабходнасць крытычнага выкарыстання тэрміналогіі, якая ўжываецца для апісання савецкай архітэктурнай спадчыны, а таксама прапанаваны прынцыпы прафесійнай інтэрпрэтацыі і захавання сталінскай архітэктуры як спецыфічнай катэгорыі складанай спадчыны, што ўлічваюць неабходнасць адначасовага захавання яе архітэктурных вартасцей і крытычнай інтэрпрэтацыі інтэграваных у яе ідэалагічных кампанентаў.

Раман Забела — беларускі архітэктар-рэстаўратар, грамадскі дзеяч. Скончыў у 2011 годзе архітэктурны факультэт, у 2012 годзе — магістратуру Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

Атрымаў у 2012—2013 гадах паслядыпломную адукацыю па сацыялізацыі «Кансервацыя помнікаў архітэктары і горадабудаўніцтва» ў Кракаўскім політэхнічным універсітэце імя Тадэвуша Касцюшкі (Польшча).

Выкладаў у 2014—2020 гадах архітэктурнае праектаванне, архітэктурную кампазіцыю, рэстаўрацыю помнікаў архітэктуры на архітэктурным факультэце БНТУ. У жніўні 2020 года звольніўся па ўласным жаданні.

Практычную рэстаўрацыйную дзейнасць ажыццяўляе з 2011 года.

Спецыялізуецца на правядзенні комплексных перадпраектных даследаванняў помнікаў, распрацоўцы праектных рашэнняў па рэстаўрацыі, навукова-метадычным кіраўніцтве на стадыі распрацоўкі праектнай дакументацыі і правядзення работ, распрацоўцы праектаў комплекснай рэгенерацыі гістарычных тэрыторый. Даследуе сістэму вартасцяў помнікаў архітэктуры і ўрбаністыкі, методыкі іх захавання

Выбар правапіснай кадыфікацыі, моўнага канону і культурнай арыентацыі: ці ёсьць узаемазалежнасьць

Вінцук Вячорка
Інстытут беларускае мовы

Нэалягізм “тарашкевіца” ствараўся ў пачатку 1980-х гадоў для апісаньня найперш правапіснае традыцыі, закладзенай асабіста Б. Тарашкевічам і “віленскім” колам філёлягаў, а пазьней разьвітай і кадыфікаванай у шырокім сэнсе (праз падручнікі й слоўнікі) як у Вільні, так і ў Менску. У 1990-я гады для апісаньня гэтай тэрміналягічнай традыцыі было ўведзенае ва ўжытак тэрмінаспалучэньне “беларускі клясычны правапіс” (БКП).

Кадыфікатары БКП канца XX — пачатку XXI ст. неаднаразова падкрэсьлівалі, што ўпарадкаваньне клясычнае правапіснае традыцыі ў яе проціпастаўленьні традыцыі савецкай (агульнаўжывальныя назвы тарашкевіца і наркамаўка) не вядзе да замацаваньня двух стандартаў літаратурнае мовы, а абмяжоўваецца толькі артаграфічным роўнем (зь невялікімі выняткамі, зьвязанымі зь перадачай па-беларуску пазычаньняў).

Разам з тым у сытуацыі двух правапісных стандартаў назіраецца ня толькі разьмежаваньне артаграмаў, але і адрозьненьні ва ўжываньні граматычных сродкаў, лексычных і фразэалягічных рэсурсаў, сынтаксычных канструкцыяў, у прыватнасьці, больш ці менш пурыстычна матываваных. Прыкладам, пераход з клясычнага на афіцыйны правапісны стандарт пэрыёдыка “Наша ніва” ў 2008 г. прывёў да значных зьменаў перадусім у частотнасьці пэўных лексэмаў і наагул у корпусе лексыкі ягоных тэкстаў.

У моўнай сьвядомасьці носьбітаў мовы — нелінгвістаў пашырэньне адрозьненьняў між правапіснымі варыянтамі на іншыя моўныя роўні апісваецца канструкцыямі “гаварыць тарашкевіцай”, “слова з наркамаўкі”. Такія канструкцыі можна было б лічыць некарэктнымі, калі мець на ўвазе, што тарашкевіца і наркамаўка – традыцыі толькі правапісныя. Але, магчыма, масавая сьвядомасьць фіксуе рэальны працэс/стан унармаваньня розных моўных роўняў залежна ад выбару носьбітам пэўнага правапісу.

Наша працоўная гіпотэза дапушчае ўплыў выбару правапісу на іншыя роўні мовы. Відавочна такі ўплыў зазначыўся пасьля беспрэцэдэнтнай для бальшыні моваў сьвету заканадаўчай кадыфікацыі афіцыйнага правапісу ў 2008 г. Апошняя зафіксавала кірунак на жорсткую нарматыўнасьць ня толькі правапісу, але і пэўных граматычных і нават лексычных рысаў літаратурнае мовы (французска-расейская мадэль), у той час калі граматычная і лексычная кадыфікацыя літаратурнае мовы носьбітамі клясычнага правапісу заўсёды пакідала прастору варыянтнасьці (харвацкая мадэль) пры захаваньні агульнай тэндэнцыі да выбару пурыстычных (стасоўна расейскай і ў меншай ступені польскай мовы) варыянтаў. Спробы дапусьціць большую граматычную й лексычную варыянтнасьць у межах афіцыйнага правапісу застаюцца лякальнымі.

Патрабуюць аналізу і ацэнкі з гледзішча моўнага будаўніцтва спробы тварэньня гібрыдных правапісаў з закрананьнем іншых моўных роўняў, напрыклад, графікі. Так, традыцыйная беларуская лацінская графіка рэалізуе сфармуляваны ў клясычным трактаце De orthographia Bohemica (прыпісваецца Яну Гусу) прынцып графічнага кантрасту: пазначаць дыякрытыкамі гукі, адметныя ад лацінскіх [сярэднявечнае лаціны],

але фанэматычна ўмоўна зь імі парныя. Эвалюцыя літарнага складу беларускае лацінкі скончылася ў першай палове XX ст. Кадыфікацыя лацінкі ў навучальных дапаможніках сярэдзіны і другой паловы XX ст. забясьпечыла стабільнасьць гэтае графічнае сыстэмы.

Інструкцыю па трансьлітарацыі геаграфічных назваў 2000 г. у рэдакцыі 2007 г. радыкальна розьняць ад клясычнае лацінкі: 1) скасаваньне графэмы Łł для абазначэньня [л], перадача гэтае функцыі графэме Ll і ўвядзеньне штучнай графэмы Ĺĺ для [л']; 2) ужываньне гэтай сыстэмы вылучна для афіцыйнага правапіснага стандарту. Фактычна ідзецца пра спробу ўкараніць у і без таго падзеленую графіка-артаграфічную прастору беларускае літаратурнае мовы яшчэ адзін фэномэн – афіцыйны правапіс лацінкавай трансьлітарацыяй, кажучы папулярнай мовай – „наркамаўку лацінкай".

Вінцук Вячорка — мовазнайца, пэдагог, журналіст. Сябра навуковае рады, кіраўнік сэкцыі тэрміналёгіі й сумежных кірункаў Інстытуту беларускае мовы.

Закончыў філялягічны факультэт БДУ, асьпірантуру Інстытуту мовазнайства Акадэміі навук. Выкладаў у Беларускім дзяржаўным пэдагагічным унівэрсытэце, у Віленскім унівэрсытэце, у Беларускім гуманітарным ліцэі, рэдагаваў часопіс „Спадчына". Аўтар кніг, сэрыяў артыкулаў і праграмаў у мэдыя.

Намесьнік старшыні Моўнай камісіі Беларускага фонду культуры, суаўтар яе праекту закону аб дзяржаўнасьці беларускае мовы (1990). Намесьнік старшыні Тэрміналягічнай камісіі пры Міністэрстве адукацыі; сябра Камісіі па тапаніміцы Менскага гарадзкога выканаўчага камітэту (1991–1995). Сузаснавальнік Таварыства беларускай мовы, старшыня яго анамастычнай камісіі (2010-я). Сузаснавальнік Інстытуту беларускае мовы (2024).

Навуковыя інтарэсы — беларускія правапісныя і графічныя сыстэмы, анамастыка, тэрміналёгія, варыянтнасьць у літаратурнай мове. Аўтар праекту сучаснай кадыфікацыі тарашкевіцы (1995), суаўтар зводу „Беларускі клясычны правапіс" (2005). Аўтар публікацыяў у гадавіку „Беларуская лінгвістыка", энцыкляпэдыі „Беларуская мова"; выдаў „Кароткую граматыку літоўскай мовы" (2010), рэпрынт „Biełaruskaha pravapisu" A. Лёсіка з камэнтарамі (2017). Аўтар праграмы „Гісторыя і культура беларускае мовы" для ліцэяў, суаўтар першых беларускіх праграмаў і чытанак для дашкольных установаў. Рэдактар тэрміналягічных і перакладных слоўнікаў.

ПАНЭЛЯ 3. ПРЫВАТНАЕ, ПУБЛІЧНАЕ, ДЗЯРЖАЎНАЕ

Што ўкраінцы ведаюць пра беларусаў? Супастаўленне нацыянальных гістарычных наратываў: ад Рагнеды да БССР

Андрэй Скурко

Незалежны даследчык

Гэты артыкул - спроба высветліць, як ва ўкраінскім гістарычным наратыве (за аснову ўзятая класічная праца Наталлі Якавенка і Яраслава Грыцака) адлюстраваныя паваротныя пункты гісторыі беларускай нацыі. І ці адлюстраваныя ўвогуле. А калі не — з якой прычыны. І якія высновы можна зрабіць з кожнага выпадку.

Беларусы і ўкраінцы — найбліжэйшыя народы з пункту гледжання моў і гістарычных лёсаў, калі казаць пра мінулае. І таксама з пункту гледжання геапалітычных інтарэсаў, калі казаць пра будучыню.

Аднак, як высвятляецца, уяўленне кожнай нацыі пра сябе фарміравалася з акцэнтуацыі зусім розных гістарычных падзей, або з зусім розных ацэнак адных і тых самых падзей і гістарычных асоб.

Яшчэ адзін праблемны пункт, які хацелася б асвятліць — як на ўзаемным беларуска-ўкраінскім няведанні адбілася каланіяльная спадчына XX стагоддзя. Як імперскія канцэпцыі гісторыі каланізаваных народаў паўплывалі на нацыянальныя гістарычныя наратывы і ўзаемныя ацэнкі (часам памылковыя) беларусаў і ўкраінцаў.

Праблема падаецца важнай, бо з канцэпцыі мінулага нацыі, сфармуляванай гісторыкамі, паўстаюць стэрэатыпы для агульнага ўжытку. А яны накідваюць пэўную схему калектыўных паводзін і праз гэта ўплываюць на лёс нацый і краін. І лепшае "рэтраспектыўнае ўзаемаразуменне" паслужыць лепшаму разуменню ў сучаснасці дзеля будучыні.

Пісьменнік, перакладчык, рэдактар, даследчык. Нарадзіўся ў 1978 у Крывічах (Мядзельскі раён). Скончыў украіністыку філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта (2000). Працаваў у выданні "Наша Ніва" (2000–2021, у тым ліку галоўным рэдактарам (2006–2017)). Быў адным з асноўных аўтараў часопіса "Наша гісторыя" (2018–2021). У 2021, у часе рэпрэсій пасля прэзідэнцкіх выбараў, быў асуджаны на 2,5 года зняволення. Прызнаны палітвязнем (2021–2023). У зняволенні напісаў пяць кніжак вершаў для дзяцей. Супрацоўнічае з незалежнымі выдавецтвамі як аўтар і рэдактар Лаўрэат Прэміі імя Льва Сапегі (2025). Перакладае з англійскай, польскай, украінскай, расейскай моваў. Зацікаўленні: гісторыя, культурная антрапалогія. Апошняя публікацыя: Андрэй Скурко. Скарбы пад нагамі: сямейныя архівы як частка нацыянальнай культурнай спадчыны [у:] CTRL+S. Пачатак спадчыны. Альманах. – Вільня: Ciklonas, 2025.

Скразныя тэмы ўкраінскай культуры і іх трансфармацыя падчас вайны

ЛЕКЦЫЯ

Ольга Петренко-Цеунова

Нацыянальны ўніверсітэт «Кіева-Магілянская акадэмія»

Поўнамаштабная расійска-ўкраінская вайна стала момантам радыкальнага пераасэнсавання культурных канонаў, сімвалаў і мадэляў самавызначэння. У крытычныя часы грамадствы асабліва востра звяртаюцца да пытання пераемнасці: якія элементы мінулага застаюцца жывымі, якія традыцыі здольныя тлумачыць сучаснасць, а якія культурныя формы страчваюць пераканаўчасць і паступова адыходзяць у мінулае. Украінскі выпадак паказвае, што вайна не стварае новыя культурныя коды з нуля, а хутчэй актуалізуе і пераінтэрпрэтуе глыбокія пласты гістарычнай памяці.

У дакладзе будуць разгледжаныя некалькі скразных сюжэтаў украінскай культуры і іх трансфармацыя ва ўмовах вялікай вайны. Перш за ўсё гаворка пойдзе пра змену ўяўленняў пра прастору і нацыянальны ландшафт. Украінская ментальная мапа апошніх гадоў істотна пашырылася: побач з традыцыйным вобразам «пшанічнага поля» цэнтральнае месца занялі разбураныя або прыфрантавыя гарады, стэпавыя і індустрыяльныя ландшафты Поўдня і Усходу, новыя сімвалічныя тапосы — Бахмут, Марыупаль, Херсон, Ізюм. Досвед вымушанага перасялення і ўзаемадзеяння розных

рэгіёнаў актуалізаваў даўнюю ідэю саборнасці як культурнага і палітычнага адзінства прасторы.

Асобная ўвага будзе нададзеная ўяўленням пра гістарычны час і пераемнасць. Украінская культура цягам стагоддзяў выбудоўвала легітымацыю сучаснасці праз апеляцыю да папярэдніх эпох: шляхта ранняга Новага часу звярталася да спадчыны Русі, дзеячы XIX стагоддзя — да казацкай эпохі, дзяржаўніцкія праекты 1917–1921 гадоў адначасова выкарыстоўвалі сімволіку княскай і казацкай традыцыі. Сёння гэтая логіка пераемнасці праяўляецца, у прыватнасці, у вайсковай сімволіцы і назвах брыгад, дзе суіснуюць княская, казацкая і вызваленчая традыцыі XX стагоддзя.

Адным з ключавых сюжэтаў стане вяртанне мілітарнай традыцыі ў цэнтр нацыянальнага самаўсведамлення. Украінская культурная памяць доўгі час рэдукавалася пераважна да сялянскага або этнаграфічнага вымярэння, тады як рыцарскі, шляхецкі і вайсковы этас заставаўся маргіналізаваным або выцесненым. Сёння вобраз ваяра-абаронцы зноў становіцца цэнтральным культурным тыпам, а паняцці гонару, годнасці, служэння і абароны свабоды набываюць новы грамадскі аўтарытэт. Адначасова трансфармуюцца і ўяўленні пра грамадзянскую супольнасць: валанцёрскія і гарызантальныя сувязі актуалізуюць старыя практыкі самаарганізацыі і адказнасці за агульнае дабро.

Таксама ў дакладзе будзе разгледжана сучаснае пераасэнсаванне літаратурнай і культурнай спадчыны — ад новай цікавасці да класікі і старажытнага пісьменства да папулярызацыі гістарычных стыляў, сімвалаў і формаў адзення як маніфестацыі ідэнтычнасці. Вайна паскорыла працэс адмовы ад расійскіх імперскіх наратываў пра «агульную калыску» і канчаткова абвастрыла ўсведамленне ўласнай культурнай асобнасці і гістарычнай пераемнасці.

У гэтым кантэксце сучасная ўкраінская культура паўстае не як разрыў з мінулым, а як прастора інтэнсіўнага нашароўвання сэнсаў, дзе традыцыя становіцца не дэкаратыўнай спадчынай, а спосабам самавызначэння, супраціву і праектавання будучыні.

Доктар гуманітарных навук (філалогія), магістратура праграмы двайнога дыплома Універсітэта Універсітэта Кіева-Магілянскай акадэміі «Будучыня спадчыны: культура, гісторыя, літаратура». Выкладчык Нацыянальнага ўніверсітэта Кіева-Магілянскай акадэміі, гістарычны аглядальнік «Ukrainian Week», літаратурны крытык, рэдактар. Рэдактар анталогіі «Украінскія мастакі пра літаратурнае пісьмо: ад Сярэднявечча да мадэрнізму», аўтар кнігі эсэ «Шляхетная традыцыя: скразныя тэмы ўкраінскай культуры».

«От героизации к мобилизации: Брестская крепость и авторитарная политика памяти в Беларуси»

Наталья Зданевич

M.Sc. Развитие культурного наследия; ЕГУ (привлеченный лектор курса ”маркетинг наследия”); Проект VisitBrest (бывший Фонд развития Брестской крепости); Фонд KUT (Познань).

Доклад представляет часть исследования 2025 года («Монополия на прошлое: политика памяти и региональные трансформации в Беларуси»), посвященного анализу изменений государственной политики памяти в Беларуси после 2020 года на материале официальной риторики, медиа, публичных выступлений, мемориальных практик и новых государственных инициатив, публичных материалов, новых законопроектов и др. На примере Бреста и Брестской крепости доклад показывает, как память о войне и городское наследие используются для формирования государственной версии прошлого, образа внешней угрозы и страны как «осажденной крепости».

Исследование является попыткой зафиксировать и осмыслить продолжающиеся изменения политики памяти в Беларуси за последние пять лет, а также рассмотреть их в более широком контексте современных авторитарных практик работы с историей и общественной памятью.

В докладе также будут представлены визуальные художественные работы, созданные в рамках исследования в сотрудничестве с художницей, работающей с темой памяти и городского пространства. Серия вышитых видовых открыток обращается к темам изоляции, вытеснения и символического закрытия памяти в современном Бресте.

Исследование опирается на подходы memory studies, heritage studies и современные дискуссии о репрессивной политике памяти в авторитарных режимах.

Уже около 15 лет работаю с культурным наследием — в разных форматах и с разными командами: от НГО до бизнес-партнеров.

По образованию — развитие культурного наследия (M.Sc.), по практике — продюсер и менеджер проектов, связанных с актуализацией наследия и развитием территорий.

Делаю довольно прикладные вещи: от исследований и архивной работы до создания баз данных, книг (Атлас крепости Брест-Литовск), путеводителей и мобильных приложений. Часто это проекты на стыке культуры, локальных сообществ и устойчивого развития — с фандрайзингом, партнерствами и международным сотрудничеством.

Адмоўная культура памяці: гвалтоўныя формы забыцця ад егіпецкіх фараонаў да беларускага2020-га.

Яўген Красулін

Незалежны даследчык

Культура памяці прайшла доўгі шлях развіцця ў сваіх формах – ад малюнкаў і перадачы вусных паведамленняў да вялікіх архіваў тэкстаў і фотаздымкаў. Але галоўнай мэтай заставалася перадача інфармацыі сучаснікам ці наступным пакаленням. Але працэс фармавання памяці непазбежна суправаджаўся й працэсам забыцця, калі губляліся пад час значныя кавалкі інфармацыі. Губляліся яны з натуральных падставаў – праз страту вуснай традыцыі ці напісаных тэкстаў. Але гісторыя ведае значную колькасць прыкладаў наўмыснага знішчэння ці ігнаравання / пазбягання фіксацыі інфармацыі, мэтай чаго было ўтварэнне ўмоваў для фармавання новага зместу калектыўнай памяці й маніпуляванне будучыняй.

Найбольш раннія з вядомых нам прыкладаў такіх маніпуляцыяў належаць да эпохі Старажытнага Егіпту. Напрыклад, спроба поўнага "сцірання" з гісторыі імя фараона Эхнатона – рэфарматара рэлігіі – пасля вяртання да папярэдніх культаў. Іншым прыкладам з'яўляецца палітыка хадліфату Умаядаў на тэрыторыі Харасану – праз вынішчэнне носьбітаў пэрсідскае мовы й гістарычных ведаў. Не абавязкова аб'ектамі забывання былі напісаныя тэксты. Мэтай магла быць, напрыклад, тапаніміка. І не абавязкова ў форме пераназывання. Магла выкарыстоўвацца форма пераінтэрпрэтацыі традыцыйнай назвы. Як тое адбылося, напрыклад, з Бярозай Картускай, з назвай якой у калектыўнай памяці звязалі лягенду пра Суворава, які "вешаў картуз на бярозу".

Вялікія высілкі ў гісторыі Беларусі былі звязанымі з вынішчэннем помнікаў архітэктуры, стылістыка якіх звязвала гісторыю з еўрапейскай традыцыяй: іх ці руйнавалі, ці надавалі "псэўдарускія рысы", што фармавала адпаведныя ўмовы светаўспрыяцця й успрыяцця культурных традыцыяў у беларусаў. Тое ж тычыцца і святаў, календару гістарычных падзеяў і месцаў памяці. Гэтая практыка працягваецца ў Беларусі дагэтуль.

З прадзеямі 2020-га звязана новая хваля гвалтоўнага забывання, якая закранула, у першую чаргу, ня тэксты, а фота- і відэаматэрыялы. Фактычная забарона на захаванне інфармацыі праз пагрозы (і рэялізацыю) рэпрэсіяў нарадзіла ўнутраную цэнзуру, якая прымушае знішчаць інфармацыю самім чалавекам, не зацікаўленым у знішчэнні. У выніку знікае памяць і ўзнікае "нацыя з забруленымі тварамі". Знішчэнне фотадакументаў, забарона на ўтварэнне новых фотадакументаў – усё гэта спрыяе забвенню. Узнікае пустое поле, на якім можна будаваць архітэктуру памяці ўжо ў іншым каноне. Што й будзе выкарыстана цяперашнім рэжымам.

Нарадзіўся ў 1970 г. у горадзе Менск. Скончыў школу з паглыбленым вывучэннем англійскай мовы, вучыўся ў ПТВ (дыплём з адзнакай), служыў у савецкім войску. У 1996-ым скончыў гістарычны факультэт Маскоўскага дзяржуніверсітэта імя Ламаносава (дыплём з адзнакай), вучыўся ў аспірантуры таго ж універсітэта. У 2003-ім абараніў кандыдацкую дысэртацыю на тэму "Ідэялёгія і царская ўлада ў старажытных мая". У 2001-ым удзельнічаў у архуаэпіграфічнай экспедыцыі ў паўднёвай Мексыцы. З 1998-га вёў спэцкурсы на гістарычным факультэце Белдзяржуніверсітэта, з 2005-га працаваў на поўную стайку. Вёў агульныя і спэцыяльныя курсы па гісторыі краінаў Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі, гісторыі мастацтваў. У 2012-

ым быў на стажыроўцы ва Ўсходнекітайскім педагагічным універсітэце (Шанхай). З 2016-га арганізоўваў стажыроўкі для студэнтаў факультэта ў Італіі. З 2005-га супрацоўнічаў з Аб'яднанай грамадзянскай партыяй, рыхтаваў праграмы, стратэгіі. У 2020-ым удзельнічаў у арганізацыі кампаніі Ціханоўскай. У снежні 2021-га быў вымушаны пакінуць Беларусь. У цяперашні час – незалежны даследчык, выступае палітычным аглядальнікам у незалежных беларускіх медыя.

Унікальнасць беларускага "рухомага прагалу", ці Гранічная патрэба патрабіць у палон мінулага

К. П.

TU Prague City

Апантанае занурваньне ў сямейную гісторыю нашага пакаленьня выглядае дзіўнай спробай напрасіцца мінуламу ў палон і сабатажаваць натуральны бег жыцьця наперад. Але, насамрэч, гэта шчырае памкненне ўбачыць сябе ў перспектыве, намацаць сьцены свайго мінулага і паступова высьветліць, ці гэта палон, ці родны дом, ці сценаў тых увогуле няма, а мы, бясхатнікі, кідаемся ва ўсе бакі і марым быць схопленымі ў палон канонаў і мітаў, якія нам былі неданесеныя, якія нам забыліся насадзіць і якія нам гранічна патрэбныя, каб аддыхацца і каб пасьля было ад чаго адштурхнуцца.

Камунікатыўная памяць, якая, паводле Яна Асмана, функцыянуе ў межах трох пакаленняў, патрабуе мінімальнай умовы: перадачы досведу праз жывы ланцужок. Канцэпт «плыткай прагалы» (floating gap), уведзены Янам Вансілам для апісання дынамічнага разрыву паміж жывой камунікатыўнай памяццю і далёкай, міфалагізаванай і інтытуцыялізаванай культурнай памяццю ў, пераважна, вусных супольнасцях, набывае асаблівую актуальнасць у кантэксце сучаснага беларускага досведу. Гэтая прагала падыйшла да нас небясьпечна блізка, яна дыхае холадам нам проста ў патыліцу, мы ад яе не абароненыя ні трэцім, ні другім пакаленьнем – бо нашыя бабулі, дзяды і нават бацькі часта ня здатныя ці ня маюць жаданьня ўдзельнічаць у практыцы тое штодзённай камунікацыі. І, нібыта чорная дзірка, гэтая блізкая і бязлітасная плыткая прагала пачынае ўцягваць ў сябе нашыя ўласныя, новыя досьведы. Бо новы досьвед, каб стаць урадлівай глебай для новага мысьлення і запусьціць працэс фармаваньня новых перспектыў, мусіць быць пакладзены на нешта старое, завершанае, утаптанае, мусіць быць адценены складаным, але асэнсаваным мінулым.

Культура сямейнага замоўчвання базуецца ня толькі на выпрацаванай дзесяцігоддзямі стратэгіі выжывання. Некамунікабельнасьць старэйшых часам укарэненая ў простай прэзумпцыі, што «маладым наш досьвед нецікавы». Пакаленьне «сена на асфальце», маладзёнаў, што былі выхаваныя ў савецкай зьнявазе да мінулага і яе носьбітаў, і што , адначасова, сталіся першымі ў сям"і выбітымі ў людзі – атрымалі вышэйшую адукацыю, пераехалі з вёскі ў горад і вывучылі гарадскую рускую мову – згубіла спярша цікавасць, а пасьля і магчымасць, далучыцца да ланцугу памяці і мітаў.

Новая хваля вымушанай эміграцыі узмацніла гэты разрыў яшчэ адным вымярэннем: немагчымасць вярнуцца дадому ператварае «прагалу» ў балючы і, адначасова, ратальны экзістэнцыйны фокус. Калі фізічная прастора памяці недасяжная, яе лёгка

замяніць на прастору лічбавую: пагоня за генеалагічнай памяццю – як яе вызначае Ізабэла Паровіч — узбагачае штодзённасьць салодкай бясконцасьцю дэтэктыўных росшукаў у архівах і спісах, фатаздымках і тэлефонных размовах, з такімі ж бясконцымі і задавальняючымі рэфлексіямі пра гісторыю і ідэнтычнасьць.

Гэтае даследаваньне разглядае практыку сямейнай і генеалагічнай гісторыі як адказ на апісаную сітуацыю. Асобная ўвага ў дакладзе адведзеная постаці «чалавека памяці» паводле Вансілы на прыкладзе аўтаэтнаграфічнага кейса: стварэння тэлеграм-канала для сваякоў і суседзяў колішняй вёскі Келевічы (сёння — частка Валожына) як гібрыднай онлайн-супольнасці, дзе даследчыца адначасова транслюе архіўныя знаходкі і фармуе з іх новую сямейную гісторыю. Старэйшыя родзічы каментуюць, узгадваюць, дапаўняюць — і так запускаецца зваротны рух: архіўныя знаходкі пачынаюць абрастаць вуснай гісторыяй, міты розных сямей нечаканым чынам апынаюцца ў сітуацыі аспрэчвання адзін аднаго, выпрабоўваюць свае факталагічныя падмуркі. А маладзейшыя родзічы ўцягваюцца ў дакументальныя пошукі і спарадычныя інтэрв“ю, узбагачаючы супольнасць, падзеленую часам і прасторай, новымі, нечаканымі і зьмястоўнымі сувязямі.

Кніжная дызайнерка і мастачка, даследчыца літар, сямейнай памяці і культурнай спадчыны.

ПАНЭЛЯ 4. КУЛЬТУРА ПАМЯЦІ І ЗАБЫЦЦЯ

Што ёсць традыцыя і сучаснасць? Падарожжа ў магчымыя гісторыі беларускага тэатра

Таня Арцімовіч

Эрфуртскі ўніверсітэт, навуковая супрацоўніца

Звяртаючыся да падзей 1920-х, калі фарміраваўся дыскурс прафесійнага беларускага тэатра, даклад разглядае як існуючыя мадэлі гісторыі беларускага тэатра, аспрэчваючы наратывы, пабудаваныя савецкай гістарыяграфіяй, так і нацыянальна арыентаваныя мадэлі, якія ўзніклі ў постсавецкую эпоху. Засяроджваючыся на дэкаланіяльнай метадалогіі і тэорыі перфарматыўнасці, асабліва на цялесным падыходзе, Арцімовіч прапануе пераацэнку ключавых паняццяў, такіх як «традыцыя» і «сучаснасць», як асноўных катэгорый для структуравання гістарычнага наратыва. Цэнтральны аргумент заключаецца ў тым, што дэкаланізацыя гісторыі тэатра выходзіць за рамкі эмансіпацыі культурнага наратыву ў межах геапалітычнай бінарнасці «цэнтр-перыферыя». Пытанне больш складанае, бо яно ўключае ў сябе спосаб уяўлення, у тым ліку эмансіпацыю/дэкаланізацыю/дэцэнтралізацыю метадаў тэатральнай вытворчасці.

Таня Арцімовіч — кандыдатка філасофскіх навук, якая спецыялізуецца на культуралогіі, фемінісцкай тэорыі і гісторыі. Арцімовіч атрымала ступень магістра сацыялогіі (культуралогія) у Еўрапейскім гуманітарным універсітэце (Вільнюс) і абараніла дысертацыю ў Міжнародным цэнтры вывучэння культуры (Гісенскі ўніверсітэт імя Юстуса Лібіга) на тэму авангардаў у Савецкай Беларусі. У 2024-2026 гадах яна ўдзельнічае ў міжнародным даследчым праекце «Абарона акадэмічных колаў у рызыцы» (Эрфурцкі ўніверсітэт). У 2024-25 гадах яна таксама куравала даследчую лабараторыю ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце, кіруючы навукоўцамі з Беларусі па пытаннях гендару і міграцыі. Акрамя шэрагу артыкулаў Арцімовіч аўтарка

кнігі "Эксперыментальны тэатр у Савецкай Беларусі ў перыяд адлігі: паміж мадэрнізмам і авангардам". Да друку рыхтуецца манаграфія "Мы як тыя прамацеркі'. Сляды авангардаў у Савецкай Беларусі".

Траўма без кананізацыі: маўчанне як механізм трансгенерацыйнай перадачы ў беларускім кантэксце

ЛЕКЦЫЯ

Кацярына Розіна

Незалежная даследчыца

Канцэпцыя chosen trauma Ваміка Волкана апісвае калектыўнае ментальнае ўяўленне аб масавай трагедыі, якое становіцца адным з важнейшых маркераў групавой ідэнтычнасці і перадаецца праз пакаленні. Волкан мадэлюе механізм перадачы як несвядомае дэпазітаванне пашкоджаных вобразаў сябе ў ідэнтычнасць наступнага пакалення. На аснове яго мадэлі можна вылучыць тры ўмовы фарміравання chosen trauma: падзея, публічнае афармленне праз дакументаванне гісторыі, мастацкія творы і ўстойлівае калектыўнае прысваенне праз мемарыялізацыю. Беларускі выпадак праблематызуе другую і трэцюю ўмовы і прапануе для аналізу сітуацыю, якую Волкан не разглядаў: траўму без кананізацыі.

Падзея існуе — сталінскія рэпрэсіі, масавыя растрэлы ў Курапатах і іншых месцах, дзесяткі тысяч ахвяр. Сведчанні таксама існуюць, аднак дзяржава дзейнічала не праз поўнае знішчэнне памяці, а праз пазбаўленне яе інфраструктуры: забарону на распаўсюджванне, прымус аўтараў да эміграцыі, выключэнне падзей з праграм школьнай адукацыі, адсутнасць рытуалаў і інстытутаў памяці. Сведчанні засталіся на перыферыі культурнай памяці. Вынік — не дармантная траўма ў волканаўскім сэнсе і не афармленая chosen trauma, а трэці стан, які прапаную называць аспрэчаным прысваеннем. Курапаты ілюструюць яго найбольш выразна: 1988 — называнне (артыкул Зянона Пазняка і Яўгена Шмыгалёва ў "Літаратуры і мастацтве"); 1989 — устаноўка першага крыжа на Дзяды, пачатак народнай мемарыялізацыі; 1990–2010-я — працяг грамадзянскага прысваення без дзяржаўнай інфраструктуры, штогадовыя шэсці на Дзяды, каля 500 крыжоў, усталяваных самімі грамадзянамі; красавік 2019 — знішчэнне 70 крыжоў па загадзе ўладаў; 2020 — масавая рэактывацыя вобраза Курапат у кантэксце пратэстаў. Паводле Волкана, групавыя рытуалы на гадавіну падзей— гэта свядомыя дзеянні, праз якія дзяржава афіцыйна фіксуе дату траўмы, рыхтуе цырымоніі, забяспечвае рытуальны кантэкст для калектыўнай перапрацоўкі. У беларускім выпадку гэтая інфраструктура адсутнічае; "Ноч расстраляных паэтаў" і марш на Дзяды — спробы грамадзянскай супольнасці стварыць рытуал там, дзе дзяржава яго блакуе. Адбываецца сістэматычная блакіроўка фарміравання chosen trauma як маркера групавой ідэнтычнасці — і ў гэтым перарыванні, а не ў адсутнасці памяці, заключаецца спецыфіка беларускага выпадку.

Для аналізу механізму перадачы ў такіх умовах прапаную мадэль трох узроўняў. Замоўчванне — знешні дзяржаўны прымус, які блакуе публічнае афармленне. Маўчанне — ахоўная рэакцыя першага пакалення, якое замоўчвае перажытае ўнутры сям'і. Цішыня — стан наступных пакаленняў, якія атрымліваюць пашкоджаныя вобразы (волканаўскае дэпазітаванне працуе) без мовы, без наратыву. Паводле Яэль Даніэлі, менавіта гэтая "змова маўчання", а не траўма сама па сабе, выклікае доўгатэрміновыя

наступствы. У тэрмінах Марыян Хірш беларускі выпадак — экстрэмальная форма постпамяці: калі большасць медыятараў перадачы (аповеды, вобразы, рытуалы) заблакавана альбо маргіналізавана, застаецца афект без формы — цела ведае, слоў няма. Галоўны тэарэтычны ўклад даклада — пераасэнсаванне маўчання. Маўчанне ў беларускім кантэксце — не пасіўная адсутнасць наратыву, а актыўны механізм перадачы, які спараджае цішыню як спецыфічну прастору для нашчадкаў. Chosen trauma можа існаваць у стане аспрэчанага прысваення дзесяцігоддзямі — але без магчымасці яе распазнаць, назваць і перапрацаваць.

Падзеі 2020 года — рэдкі выпадак, калі гэты механізм быў часова парушаны: маўчанне ўпершыню сустрэлася з публічнай мовай. Як паказваюць даследаванні Нэлі Бэкус і Анны Кадоні, марш на Дзяды 1 лістапада 2020 года да Курапат, акцыя "Ланцуг пакаяння" ад Курапат да Акрэсціна, плакаты з прамымі паралелямі паміж сталінскім тэрорам і сучаснымі рэпрэсіямі ("Мой дзед быў у ГУЛАГу ў XX стагоддзі. Яго ўнук — у XXI") — вывелі памяць пра рэпрэсіі за межы апазіцыйнай субкультуры, да Курапат прыйшлі людзі, якія раней ніколі не ўдзельнічалі ў працы памяці — тыя, хто заставаліся ў цішыні. Наступнае дзяржаўнае падаўленне — гэта паўторнае выгнанне ўжо прысвоенай памяці. Беларуская гісторыя памяці пра рэпрэсіі — гэта гісторыя цыклаў: масавага прарыву ў канцы 1980-х, сціскання ў 1990–2010-я, новага прарыву ў 2020 і новай блакіроўкі пасля 2021. Даклад ставіць пытанні для міждысцыплінарнай дыскусіі: як розныя пласты маўчання ўзаемадзейнічаюць у беларускім наратыве? Ці можа маўчанне пра траўму функцыянаваць як культурны канон? І — калі публічны дыскурс заблакаваны — ці мае асабістая і сямейная памяць сілу выстаяць у ізаляцыі і пры з'яўленні публічнай прасторы разбіць існуючы канон маўчання?

Псіхатэрапеўтка і стваральніца падкаста "Што ты тут забыў", прысвечанага тэмам трансгенерацыйнай перадачы траўмы і гістарычнай памяці. З 2015 года спалучае тэрапеўтычную практыку і незалежныя міждысцыплінарныя даследванні. Асаблівую ўвагу прысвячае таталітарнай спадчыне ў беларускім кантэксце, пытанням замоўчвання і маўчання, перадачы траўматычнага досведа на індывідуальным і калектыўным узроўнях

ПАНЭЛЯ 5. ПРАДУКАВАННЕ КАНОНАЎ У МУЗЭЯХ

Беларуский материал в музее Яд Вашем: известное, неизвестное и недосказанное

Яўген Розін

Незалежны даследчык

Доклад представляет взгляд изнутри институции на то, как беларуское еврейство представлено в Яд Вашем — одной из крупнейших мировых институций памяти о Холокосте. На основе многолетней работы с коллекцией артефактов и семейными архивами, а также сотен интервью, проведенных с выжившими в Холокосте и их семьями, автор анализирует пути поступления белорусских материалов, особенности их репрезентации и методологические сложности, редко обсуждаемые публично.

В докладе материал анализируется на трех уровнях.

Известное. Освещаются основные каналы поступления артефактов и документов из Беларуси в Яд Вашем: личная передача репатриантами из Беларуси и их семьями;

полевые экспедиции сотрудников музея в Беларусь и страны Восточной Европы; программа Праведников народов мира, через которую в музей поступают свидетельства, фотографии и документы. Важной частью этой работы в последние годы стал общеизраильский проект «Леесоф эт ха-Шварим» («Собрать осколки»), в котором автор принимал участие.

Неизвестное. Обнаруживаются пробелы и асимметрии в репрезентации белорусского еврейства в музейном и архивном пространстве Яд Вашем. Какие регионы и сюжеты входят в канонический нарратив, а какие представлены фрагментарно или почти отсутствуют. Особое внимание уделяется теме маркировки евреев - автор впервые собрал и систематизировал в едином корпусе сведения о практиках маркировки евреев на оккупированных территориях Восточной Европы и постсоветского пространства, включая Беларусь, — данные, которые до этого существовали лишь разрозненно.

Недосказанное. Поднимаются сложные вопросы музейной атрибуции и пересмотра существующих нарративов. На примере артефакта, первоначально представленного в экспозиции как связанного с еврейским партизанским движением, рассматривается процесс последующей верификации: свидетельства выживших Минского гетто и семейные интервью поставили под сомнение первоначальную идентификацию владельца предмета.

Доклад опирается на опыт музейной практики и ставит вопрос: как крупная международная институция памяти репрезентирует беларуское еврейство и что это говорит о возможностях и пробелах в формировании собственно беларуского нарратива о Холокосте

Евгений Розин — исследователь, специалист по материальному наследию Холокоста. В течение одиннадцати лет работал исследователем в отделе артефактов музея Яд Вашем (Иерусалим), где провёл сотни исследований предметов и документов, восстанавливая истории их владельцев и семей. Участвовал в подготовке международных выставок — в Бундестаге и австрийском парламенте. В своей работе сочетает архивные методы с полевыми исследованиями и интервьюированием выживших и их семей. С 2024 года живёт в Кракове, работал ассистентом куратора в музее фабрики Оскара Шиндлера в Кракове, принимал участие в подготовке выставки "Дети войны". Занимается генеалогическими исследованиями и сопровождением семей, ищущих свои корни в Польше и Восточной Европе

Сучасныя практыкі і падыходы ў выкарыстанні вуснагістарычных сведчанняў у экспазіцыях еўрапейскіх музеяў і інтэрнэт-праектах па тэме камуністычных рэпрэсіяў як аснова канцэпцыі абноўленага Віртуальнага музея савекіх рэпрэсіяў у Беларусі

ПАНЭЛЯ 5. ПРАДУКАВАННЕ КАНОНАЎ У МУЗЭЯХ

Валерыя Чарнаморцава

Магістратура ЕГУ (Разьвіцьцё культурнай спадчыны, 2025), зараз незалежная дасьледчыца

Даследаванне сучасных практыкаў і падыходаў у выкарыстанні вуснагістарычных сведчанняў у музейных экспазіцыях і інтэрнэт-праектах Усходняй Еўропы, звязаных з савецкімі рэпрэсіямі, павінны стаць асновай у распрацоўцы прынцыпаў абноўленай канцэпцыі Віртуальнага музея савецкіх рэпрэсіяў у Беларусі.

Ключавымі для гэтага даследвання сталі 2 асноўныя падыходы ў выкарыстанні вуснай гісторыі для стварэння музейнай экспазіцыі:

1. Збор вуснагістарычных сведчанняў, каб вывучыць і распавесці ў музейнай камунікацыі гісторыі матэрыяльных артэфактаў як асноўных экспанатаў;

2. Выкарыстанне вуснагістарычных сведчанняў як незалежных аб'ектаў, асноўных экспанатаў, вакол якіх будуецца экспазіцыя, а матэрыяльныя артэфакты з'яўляюцца толькі дадатковымі доказамі распаведзеных жыццёвых гісторыяў.

Менавіта другі падыход быў вызначаны як больш сучасны для ацэнкі найлепшых практыкаў і падыходаў выкарыстання вуснагістарычных сведчанняў ў экспазіцыях музеяў і анлайн-праектаў.

У гэтым дакладзе прадсталенае даследванне наступных музеяў і анлайн- праектаў Усходняй Еўропы:

Музей акупацыі Латвіі ў Рызе;

Музей акупацыі і свабоды Vabamu;

Музей Памяці Сібіру ў Беластоку;

Музей Катыні ў Варшаве;

Мемарыяльны музей турмы Хоэншонхаўзэн (Штазі) ў Берліне;

Музей камунізма ў Празе;

Чэшскі анлайн-праект GULAG.cz;

Чэшская некамерцыйная адукацыйная арганізацыя PostBellum з праектам «Paměť národa» і 2-ма інтэратыўнымі музейнымі філіяламі ў Брно і Пардубіцэ, заснаванымі выключна на вуснагістарычных сведчаннях.

Менавіта інтэрактыўныя імерсіўныя музейныя экспазіцыі з экскурсіямі-квэстамі ў філялах чэшскай арганізацыі PostBellum у Брно і Пардубіцэ, заснаваныя выключна на вуснагістарычных сведчаннях без выкарыстання традыцыйных матэрыяльных артэфактаў ёсць найцікавейшымі кейсамі гэтага даследвання ў кантэксце сучасных падыходаў у выкарыстанні вуснагістарычных сведчанняў у музейных экспазіцыях.

Пакуль асноўнай практыкай выкарыстання вуснагістарычных сведчанняў у музейных экспазіцыях і онлайн-праектах застаецца дэманстраванне на экранах ці планшэтах з навушнікамі так званых "гаворачых галоваў". Але, як можна бачыць з даследваных кейсаў, зараз усё больш пашыраюцца іншыя магчымасці рэпрэзэнтацыі вуснагістарычных сведчанняў з дапамогай новых тэхналогіяў, такіх як 3D-мадэляванне, дапоўненая і віртуальная рэальнасць, галаграмы, аўдыё-светлавыя інсталяцыі, а таксама пры дапамозе гейміфікацыі ў выглядзе квэстаў ды іншых імерсіўных і патысіпатыўных практыкаў, якія ўцягваюць наведнікаў у дзеянне і дазваляюць асабіста перажываць даматычныя моманты лёсу сведкаў савецкіх рэпрэсіяў ды іншых траўматычных падзеяў мінулага. Яшчэ адным цікавым падыходам да выкарыстання вуснагістарычных сведчанняў, асабліва для дзяцей і моладзі з'яўляюцца коміксы ці графічныя раманы (graphic novels) на падставе трагічных лёсаў сведкаў савецкіх рэпрэсіяў і стварэнне адпаведных кампутарных гульняў. І вельмі вялікія магчымасці ў выкарыстанні вуснагістарычных успамінаў адкрываюцца з ужываннем штучнага інтэлекту.

Праблема ўсіх гэтых сучасных падыходаў і практыкаў выкарыстання траўматычных вуснагістарычных сведчанняў у музеях і онлайн-праектах палягае ў тым, што сведчанні вуснай гісторыі самі па сабе аказваюць моцнае эмацыянальнае ўздзеянне, а ўзмоцненае ўздзеяннем такіх падыходаў можа залішне рэтраўматызаваць наведнікаў, таму выкарыстанне гэтых практыкаў патрабуе ўзважанага падыходу да іх выкарыста-

ння, такіх як абмежаванні па ўзросце і па здароўі.

Асноўныя высновы прадстаўленага даследвання:

1. Сучасныя музеі і анлайн-праекты Усходняй Еўропы, звязаныя з савецкімі рэпрэсіямі, імкнуцца камунікаваць з наведнікамі з дапамогай сторытэлінга, асабістых гісторыяў, якія перадаюцца праз вуснагістарычныя сведчанні.

2. Найбольш цікавыя сучасныя падыходы і практыкі ў выкарыстанні вуснагістарычных сведчанняў у музейных экспазіцыях звязаныя з новымі тэхналогіямі, максімальнай інтэрактыўнасцю, мультымедыйнасцю, імерсіўнасцю і патысіпатыўнасцю, уцягнутасцю наведнікаў, што варта выкарыстоўваць для абноўленай канцэпцыі Віртуальнага музея савецкіх рэпрэсіяў у Беларусі.

Гэтая абноўленая канцэпцыя павінна грунтавацца на інтэрактыўным, імерсіўным падыходзе да патэнцыйных анлайн-наведнікаў з выкарыстнаннем тэхналогіяў віртуальнай рэальнасці і штучнага інтэлекту, з актыўным ужываннем гейміфікацыі, рознага кшталту квэстаў і апытанак. Па прыкладзе даследваных музеяў і анлайн-праектаў Віртуальны музей савецкіх рэпрэсіяў мае патэнцыял таксама стаць мультыфункцыянальным цэнтрам, які можа таксама праводзіць шырокую культурна-асветніцкую дзейнасць.

Валерыя Чарнаморцава - экскурсаводка, арганізатарка вандровак і адукацыйных онлайн-курсаў нефармальнай адукацыі для дарслых, вусны гісторык, даследчыца спадчыны па тэме савецкіх рэпрэсіяў. У 2016-м годзе скончыла курсы экскурсаводаў, абараніла выпускную працу "Турыстычны патэнцыял урочышча "Курапаты". Летась скончыла курсы экскурсаводаў у Літве, зараз з'яйляецца атэставаным гідам па Вільні і Літве.

З 2007-га года вяла ў аргкамітэце БХД праект "Пакаянне", запісвала па ўсёй Беларусі вуснагістарычныя сведчанні былых вязьняў ГУЛАГу. Сабраныя матэрыялы сталі асновай Віртуальнага музея савецкіх рэпрэсіяў у Беларусі represii.net.

З 2023-га года вымушана апынуўшыся ў Вільні, скончыла магістратуру ЕГУ. Магістарская зьвязаная з выкарыстаньнем вуснагістарычных успамінаў у экспазіцыях музеяў Еўропы і на віртуальных рэсурсах па тэме камуністычных рэпрэсіяў.

Беларускія музеі і трактоўка спадчыны як адлюстраванне савецкай культурнай перыферыі. Ці не варта пачаць дыскусію аб змене парадыгмы?

ПАНЭЛЯ 5. ПРАДУКАВАННЕ КАНОНАЎ У МУЗЭЯХ

Раман Крыцук

Нацыянальны музей у Варшаве

Экспазіцыя сярэднестатыстычнага беларускага краязнаўчага раённага ці абласнога музея звычайна пабудавана па вельмі простай схеме, якую можна акрэсліць наступным чынам: археалагічныя матэрыялы (ад каменнага веку да часоў ВКЛ і Рэчы Паспалітай), рэчавыя помнікі XVII – пач. XX ст., этнаграфія рэгіёну, палітычныя рухі XIX–XX стст. і "ўсталяванне савецкай улады", "Вялікая Айчынная вайна" і пасляваенны перыяд. Дадзены падыход быў характэрны для савецкай сістэмы і распаўсюджваўся на ўсю перыферыю, акрамя цэнтру – Масквы і Ленінграда. Апошнія, акрамя таго што мелі манаполію на культурнае рабаванне правінцый, маглі фарміраваць свае музейныя калекцыі, не прытрымліваючыся вышэйузгаданага шаблону.

Маскоўскія і ленінградскія музеі без праблем маглі папаўняць свае калекцыі па любым кірунку – кітайскае, японскае, карэйскае мастацтва, візантыйскія, вавілонскія і егіпецкія артэфакты, этнаграфічныя калекцыі Усходу, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі і г.д. Існуючы тады падыход да папаўнення фондаў большасці музеяў толькі вузкаспецыялізаванымі прадметамі, якія б адлюстроўвалі гісторыю з пункту гледжання савецкіх ідэалагічных нормаў, крытыкаваўся толькі асобамі, якія паходзілі з-за савецкай сістэмы, як, напрыклад, Надзея Хадасевіч-Лежэ.

Дарэвалюцыйныя музейныя і прыватныя калекцыі не мелі такіх абмежаванняў. Найлепшымі прыкладамі будуць музей Ханенкаў у Кіеве, у якім прадстаўлены прадметы ад Старажытнага Егіпта і Грэцыі да старых еўрапейскіх майстроў і традыцыйных рамёстваў Азіі; музей Чартарыйскіх у Кракаве з каласальнымі калекцыямі традыцыйных рамёстваў і мастацтва Еўропы; і нават віцебскія прыватныя калекцыі Федаровіча і Брадоўскага, на базе якіх паўстаў Віцебскі абласны краязнаўчы музей.

Падаецца, пасля распаду савецкай сістэмы беларускія музеі павінны былі ўцягнуцца ў агульнасусветнае музейнае жыццё і пачаць фарміраваць калекцыі адпаведна сусветным стандартам, не зацыкліваццa ў абмежаваных межах гісторыі “Русь – ВКЛ – Рэч Паспалітая”. Але гэтага не адбылося па некалькіх прычынах. Галоўная з іх – змена дзяржаўнага падыходу да фінансавання музеяў, якая прывяла да татальнага недахопу сродкаў, якога не было нават у савецкія часы. Другая па важнасці – гэта неразуменне таго, што на дадзены момант нават пры наяўнасці грошай немагчыма сабраць сур’ёзную калекцыю па ВКЛ ці Рэчы Паспалітай. Колькасць артэфактаў XIV–XVIII стст. па гэтай тэме ў разы меншая ў параўнанні з аналагічнымі рэчамі з Заходняй і Цэнтральнай Еўропы, і яны ў большасці сваёй ужо даўно захоўваюцца ў замежных архівах, музеях і бібліятэках. У выніку чаго ў Беларусі паўстаў шэраг новых музейных экспазіцый, запоўненых копіямі і муляжамі прадметаў вышэйузгаданай эпохі (замак у Лідзе, палац Агінскіх у Залессі, палац Бутрымовічаў у Пінску, палац Булгакаў у Жылічах і г.д.). Трэцяя, апошняя прычына, па якой беларускія музеі пазбягаюць купляць падобныя прадметы, – гэта абмежаванасць унутранага рынку, немагчымасць для музеяў набываць прадметы на замежных аўкцыёнах, а таксама брак спецыялістаў па адпаведных кірунках.

Безумоўна, ніхто з нас на дадзены момант не можа паўплываць на сучасную музейную палітыку, звязаную з фарміраваннем музейных калекцый, – гэта можа змяніць толькі дзяржава. Але мы можам зараз закласці падмурак для будучай дыскусіі на дадзеную тэму, дыскусіі, якая зможа змяніць сітуацыю не зараз, а праз 10–15–20 гадоў.

З 1 снежня 2014 г. — працаўнік Аддзела археалогіі, нумізматыкі і зброі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь на пасадзе малодшага навуковага супрацоўніка.

З 1 ліпеня 2016 г. пераведзены на пасаду навуковага супрацоўніка аддзела археалогіі, нумізматыкі і зброі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь; з 2018 года — куратар нумізматычнай і баністычнай калекцый.

2 студзеня 2019 г. пераведзены на пасаду старшага навуковага супрацоўніка ў Аддзел археалогіі, нумізматыкі і зброі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.

Распрацоўшчык канцэпцыі для дзвюх выстаў у Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь:

1. «Ад рымскага дэнарыя да беларускага рубля» (2016–2020).

2. «Зладзейскія грошы, або Гісторыя фальшываманецтва» (2018). З 14 снежня 2021 года — супрацоўнік Кабінета манет і медалёў Нацыянальнага музея ў Варшаве.

З 18 ліпеня 2022 года працую на пасадзе ад'юнкта і куратара калекцыі польскіх манет Кабінета манет і медалёў Нацыянальнага музея ў Варшаве.

Музей Вялікай Айчыннай вайны БССР, савецкія ваеннапалонныя і канон «ўсенароднай партызанскай барацьбы» (1940–1980-я гг.)

Яніна Карпенкіна

Незалежная даследчыца

Пасля вызвалення Беларусі ад нацысцкай акупацыі савецкая ўлада сутыкнулася з праблемай унутранага расколу грамадства і недахопу даверу да насельніцтва заходніх рэгіёнаў. У гэтых умовах пачынаючы з 1944 года фарміруецца новы афіцыйны наратыў, які рэпрэзентуе Беларусь не як акупаваную тэрыторыю, а як «партызанскі край». Ключавую ролю ў стварэнні і трансляцыі гэтага наратыву адыграў Беларускі дзяржаўны музей Вялікай Айчыннай вайны, які фактычна выконваў функцыю адсутнага рэспубліканскага гістарычнага музея.

У дакладзе на падставе архіўных матэрыялаў і сучасных даследаванняў разглядаецца працэс інстытуцыяналізацыі міфа пра «ўсенародную партызанскую барацьбу» ад стварэння ваенна-гістарычнай камісіі Панцеляймона Панамарэнкі (1942) да 1980-х гадоў. Асаблівая ўвага надаецца таму, як музейная экспазіцыя і выставачная дзейнасць паступова выцяснялі з афіцыйнай памяці «незручныя» сюжэты — найперш гісторыю савецкіх ваеннапалонных, якія складалі значную частку страт насельніцтва БССР (не менш за 700 000 чалавек). У той час як партызанскі рух абвяшчаўся выключна беларускім феноменам і калектыўным подзвігам народа, лёс сотняў тысяч ваеннапалонных, што прайшлі праз фільтрацыйныя лагеры, аказваўся маргіналізаваным у публічнай прасторы.

Аналіз экспазіцыйных планаў музея, яго структуры падпарадкавання і тэматыкі першых выставак паказвае, што кананічны наратыў аб Вялікай Айчыннай вайне ў БССР быў не проста гераізацыяй партызан, але інструментам канструявання новай лінейнай гісторыі савецкай беларускай дзяржаўнасці. Вайна і акупацыя былі пераасэнсаваны як момант нараджэння абноўленай савецкай супольнасці, у якой этнічныя беларусы выступалі галоўнымі суб'ектамі супраціву. Такі падыход вёў да сістэмнага выключэння з калектыўнай памяці не толькі ваеннапалонных, але і іншых груп (яўрэйскага насельніцтва, астарабайтэраў, асоб, якія апынуліся пад падазрэннем у калабарацыі). Такім чынам, фарміраванне музейнага канону «ўсенароднай партызанскай барацьбы» стала важным механізмам пасляваеннай легітымацыі ўлады і стварэння новай гістарычнай самаідэнтыфікацыі беларусаў, адначасова хаваючы складаныя і балючыя бакі ваеннага вопыту.

Посцілка - настальгія па прыгажосці: аб актуалізацыі сялянскай культурнай спадчыны.

Вольга Лабачэўская
Незалежны даследчык

Посцілка – гэта саматканая рэч, якія ў вялікай колькасці да 1980-х гг. выраблялі жанчыны беларускіх вёсак для уласных практычных і эстэтычных патрэб.

У артыкуле з пункта гледжання культурнай антрапалогіі разглядаецца прычыны пашырэння ў беларускай вёсцы гэта віду тэкстыльнага вырабу ў XX ст., які замяніў сабой традыцыйны асартымент вясковых тканін: палатно, ручнікі. Падкрэсліваецца эстэтычная функцыя посцілкі, творчы характар яе вырабу, значэнне ў вясельным абрадзе пасляваеннага часу, ужыванне посцілак пры выкананні сямейных фотаздымкаў.

У наш час адбылася актуалізацыя традыцыйнай рэчы ў сферы сучаснай культуры, наданне ёй новых сімвалічных і культурных сэнсаў, выкарыстанне ў мастацкіх практыках. Аналізуюцца мастацкія праекты пачатку XX ст., дзе посцілка робіцца арт-аб'ектам, надзяляецца сімвалічнымі канатацыямі, звязанымі з пераасэнсаваннем значнасці культурнай спадчыны вясковай культуры ў беларускім грамадстве, пераасэнсаваннем яе здабыткаў, пошукамі нацыянальнай ідэнтычнасці. Творчыя прадстаўнікі гарадской культуры рэалізуюць у сваіх праектах ідэал "страчанага раю", атаясамліваючы яго з вясковымі вытокамі беларускай адметнасці.

Падкрэсліваецца, што выданне кнігі Вольга Лабачэўскай "Беларускія посцілкі і дываны: антрапалогія традыцыйнай рэчы" (2021), паспрыяла пашырэнню ў беларускім грамадстве ведаў аб гэтай частцы беларускай культурнай спадчыны і садзейнічала паскарэнню механізма яе культурнай адаптацыі ў формах уключэння ў гарадскі інтэр'ер у якасці сямейных рэліквій, калекцыянавання, выкарыстання у якасці фонаў для фатаграфавання, аднаўлення тэхналогій вырабу (ручное ткацтва), інтэрпрэтацыі ў творах выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, моды і інш.

Праводзяцца аналогіі са шляхамі сімвалізацыі і актуалізацыі з іншымі творамі народнай спадчыны: маляванымі дыванамі, якія набылі ў сучаснай культуры статус беларускіх культурных сімвалаў.

У вывадах падкрэсліваецца, што апісаныя працэсы шчыльна спаяны з агульнымі нацыятворчымі напрамкамі развіцця сучаснай культуры беларусаў, узмацненнем пошукаў беларускай ідэнтычнасці, якія абапіраюцца на выразныя візуальныя знакі, надаюць ім значэнне сімвалаў і здабыткаў нацыянальнай культурнай спадчыны.

доктар мастацтвазнаўства, дацэнт, незалежны даследчык. У кола навуковых інтарэсаў уваходзіць: гісторыя культуры Беларусі, пытанні культурнай антрапалогіі, тэорыі і гісторыі народнага мастацтва, промыслаў і рамёстваў, гісторыя беларускай этнаграфічнай фатаграфіі і інш. Лаўрэат Нацыянальнай прэміі ў галіне выяўленчага мастацтва ў намінацыі «мастацтвазнаўства і крытыка» за 2020 г.; Прэмій Кангрэса даследчыкаў культуры Беларусі за 2021 і 1925 гг. у катэгорыі «гуманітарныя навукі» (артыкулы). Аўтар больш за 250 навуковых публікацый, у тым ліку манаграфій: Зберагаючы самабытнасць. З гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі (1998), Захавальнік Палескага музея – Дзмітрый Георгіеўскі (2001), Повязь часоў – беларускі ручнік (2002), Сялянская энцыклапедыя ў творах Мікалая Тарсюка (2008), Палескія былі ў творах Івана Супрунчыка (2012), Белорусский народный текстиль: художественные основы, взаимосвязи, новации (2013), Мастацтва

дзеля славы Божай: саламяныя іканастасныя вароты і царкоўна-культавыя прадметы (2018), Беларускія посцілкі і дываны: Антрапалогія і мастацтва традыцыйнай рэчы (2021), Аброкі. Абыдзённікі: жаночыя рытуальныя практыкі (2025); аўтар ўступных артыкулаў і складальнік фотаальбомаў: Беларусы у фотаздымках Ісака Сербава 1911–1912 гадоў (2012), Вандроўкі па Палессі: фотаздымкі 1923–1939 гадоў са збору Музея Беларускага Палесся ў Пінску (2021), Экспедыцыя Вацлава Ластоўскага 1928 году: захаваная спадчына (2024).

Беларуская традыцыйная культура: вынаходніцтва этнографаў XIX - XX ст., канструяванне актывістаў 1980-х гг. ці рэальнасць народнай практыкі вяскоовага насельніцтва

ПАНЭЛЯ 6. КАНОН І ПОБЫТ

Сцяпан Захаркевіч

ЕГУ

Канцэпт ”беларуская традыцыйная культура” стала выкарыстоўваецца з канца XX ст. у дачыненні да этнічнай культуры беларускага вясковага насельніцтва. Рэпертуары матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры вясковых беларусаў дзякуючы этнолагам, палітыкам, а таксама дзеячам культуры і практыкам атрымалі легітымную нарматыўнасць як беларускі нацыянальны канон. У час глабалізацыі, ва ўмовах канкурэнцыі некалькіх нацыянальных праектаў (постпрасавецкага і этнічнага) назіраецца працэс вынаходніцтва беларускай традыцыйнай культуры (у рэчышчы ідэй Э.Хабсбаума і Т.Рэйнджэра) і яе выкарыстання ў палітычных мэтах абодвума праектамі. Даклад накіраваны на асэнсаванне інтэлектуальнага выкарыстання канцэпта і аналізу гісторыі яго з’яўлення і эвалюцыі як важнай тэрыі нацыянальнага ўтаасэнсавання сучаснага беларускага грамадства.

кандыдат гістарычных навук, дацэнт, антраполаг, гісторык. Займаецца сучаснай беларускай культурай, беларускім нацыяналізмам, гісторыяй беларускай этналогіі

Гендарны падыход у асучасьненьні канонаў беларускай культуры на прыкладзе зьявы ”бязкніжнага пісьменьніцтва”.

ПАНЭЛЯ 6. КАНОН І ПОБЫТ

Уладзіслаў Іваноў

Цэнтар гендарных дасьледаваньняў, ЭГУ / выдавецтва Скарына, Лёндан

Выступ прысьвечаны таму, як гендарны падыход дапамагае нанова прачытаць беларускія культурныя каноны — літаратуру, гісторыю, мастацтва і нацыянальныя міты. У цэнтры ўвагі — пытаньні, чые галасы традыцыйна траплялі ў канон, а чые заставаліся на пэрыфэрыі. Гендарная оптыка дазваляе зрабіць больш бачнымі ўнёскі жанчынаў, а таксама раскрыць мэханізмы фармаваньня культурнага аўтарытэту і нацыянальнай памяці. Асучасьненьне канонаў разумеецца не як адмова ад традыцыі, а як яе пашырэньне і актуалізацыя ў кантэксьце сучасных каштоўнасьцяў — інклюзіўнасьці, роўнасьці і культурнай разнастайнасьці. На прыкладзе фэномэну, які ахоплівае збольшага жанчынаў і, які я назваў бы ”бязкніжнае пісьменьніцтва”, асабліва выразна бачыцца патрэба карэкты, асучасьненьня беларускіх культурных ды іншы канонаў.

Выкладнік, сацыялінгвіст і перакладнік. Старшы супрацоўнік Цэнтру гендарных дасьледаваньняў ЭГУ. Адзін з рэдактараў выдавецтва "Скарына".

ПАНЭЛЯ 6.
КАНОН І ПОБЫТ

Fashioning the Urban Tissue: City planning, garment design, and gender performance in Minsk

Emma Louise Leahy
Independent researcher

During the latter twentieth century, Minsk developed a singular urban identity as a mediaeval town with a modern fabric. The extensiveness of its postwar reconstruction made the capital of the BSSR more "Soviet" than any city of comparable stature in the European part of the USSR. The triad of architecture, monumental art, and fashion — all creative disciplines employed as propaganda instruments to give tangible form to the communist project — converged at the heart of Minsk in a site called the House of Models. A garment design workshop and adjacent showroom space completed during the mid sixties, the architectural complex was important in a dual sense to the ideological education of the masses. First, the front face of the showroom was embellished with a sculptural relief of monumental proportions whose central location made it one of Minsk's most visible works of public art. The House of Models was consequently a prominent spatial environment for the representation of state propaganda narratives during the Brezhnev era. More than that, the complex is worthy of study as a microcosm of the ways in which gender roles have been determined throughout the late Soviet period and beyond. The Soviet understanding of fashion modelling relied on a particular gender logic that at once desexualised femininity and put it on public display, making strategic use of womanhood as a performative instrument to legitimate state socialism at home and abroad. Personal dress was thus inseparable from cultural politics; far from being a matter of individual preference it was expected to adhere to an ensemble of norms centrally quantified by expert professionals. Minsk after 1991 is often described as a "museum" of Soviet architecture. It is certainly true that, with some notable additions and alterations, the footprint of the city centre looks much like it did the previous century. However the notion of Minsk as an open-air museum could appear to support a false impression that the Belarusian capital has not meaningfully changed over the last three decades. It would be more accurate to imagine today's Belarusian capital not as a historical museum but a living stage dynamically contested by different actors. Current authorities seek to monopolise the built landscape as a showplace of state power, making selective and strategic use of the twentieth-century urban-architectural inheritance in pursuit of this objective. Civically minded locals meanwhile see landmarks as rallying points for the assertion of a citizen right to participate in municipal governance processes. For the political opposition, Minsk's Soviet-era monumental spaces are strategic objectives to be reappropriated and resignified by means of performance-based protest actions. Much in the same way, understandings of gender roles have evolved appreciably over three decades of independence, with the result that femininity has again become entangled with political discourse. Whereas the state aspires to domesticate womanhood as an accessory to its exercise of power, the opposition seeks to subvert established tropes by turning to gendered performance as a compelling language of dissent, visible in 2020 through the unique phenomenon Sasha Razor calls "feminist craftivism".

Emma Louise Leahy holds a doctorate in history and cultures of Europe from Università La Sapienza (2026), where she researched the urban experience and intellectual life amidst the culturalCold War. Her thesis project was a comparative study of late socialist architectural muralism in East Germany, Ukraine, and Belarus. She holds a MA in International Affairs from The Hertie School and a BA in Government and International Politics from George Mason University. She has held fellowships with the Woodrow Wilson International Center for Scholars, Central European University, and the US Department of Education. Her professional background is in public diplomacy and museum programming.

Джаз у Вільні 1920-30-х гг.: Тры колеры ”Штраляў”

Віктар Сямашка

Беларускае Радыё Рацыя

Даклад прысьвечаны тройцы цукерняў «Штраль» у Вільні 1920-30-х гг., якія сталі ня толькі мейсцамі гістарычных падзеяў, былі папулярныя сярод беларускае інтэлігенцыі, але прадаставілі свае пляцоўкі для раньняга джазу.

1. «Белы Штраль» хоць і быў першынцам у сямействе, але ў міжваенны пэрыяд стаўся найменш вядомым і займаў меншае памяшканьне, чым яго «Чырвоны» й «Зялёны» браты. Аднак, па словах джазавага дасьледчыка Кшыштафа Карпіньскага, «Белы» лічыўся найбольш утульным і камэрным. Музыка ў «Белым Штралі», наколькі можна меркаваць з аб“яў, таксама гучэла ня кожны дзень у адрозьненьне ад «Зялёнага».

З канца 1939-гатут сталі ладзіцца мастацкія выставы, конкурсы сьвінгу, рэгулярна граў Pocket Jazz (то бок, Кішэнны) на чале з Генрыкам Чыжом. Ансамбаль заснавалі навучэнцы Гімназіі айцоў Езуітаў, якая месьцілася непадалёк – на Вялікай 58. Падчас нямецкай акупацыі польскія артысты як уцекачы, так і мясцовыя, адкрылі ў «Белым Штралі» літаратурна-музычнае кабарэ «Ксантыпа». Ня будзем пералічаць усіх, але да кабарэ мелі дачыненьне джазавы піяніста Леон Помэрс з Пружанаў, сьпявак і літаратар Рышард Кярсноўскі з-пад Баранавічаў, публіцыста й папулярызатар джазу Леопальд Тырманд і сьпявачка Марта Мірская з Варшавы (ейны пазнавальны альт у слоўфоксе Зыгмунта Карасіньскага, сыграным аркестрай Чыжа, пачуем напрыканцы). Мяркуючы па ўспамінах, у кабарэ «Ксантыпа» ў «Белым Штралі» наведваўся й паэта Тадэвуш Вітлін, які супрацоўнічаў з Польскім тэатрам мініятураў у савецкім Беластоку, даволі джазавым па натуры.

2. Свой унёсак у папулярнасьць «Чырвонага Штраля», безумоўна, унесьлі й разнастайныя забаўляльныя аркестры – ад мандаліністаў да джазбандзістаў. Аўтар «Віленскі кур“ера» пад нікам Wel трапіў туды на танцы: «Увечары адбываецца ў Штраля дансынг. Гэта найэканамічнейшы дансынг, які я ведаю, сказаў бы, крызысны. За кошт двух паўчорных і аднаго пірожнага можна адарвацца, вытанцавацца да сёмага поту з уласнай танцоркай, а каму таго мала, падыходзіць да чужых столікаў і радуе сэрца нетанцуючых запрашэньнем іх таварышкі. Як шалець, то напоўніцу!»

Калі зазірнуць у мэню, то, сапраўды, акром розных гарачых напояў і пірожных уласнага вырабу, у «Чырвоным Штралі» падаваліся піва ды віно. Для нас жа галоўная інфармацыя зьмяшчалася на вокладцы: «Штодзённыя канцэрты ад 17-ай да 23-яй. Па

нядзелях і ў сьвяты – музычныя ранішнікі». Хто адказваў за гэтую частку прапановы? Да прыкладу, захавалася праграмка за 22 сакавіка 1938 году. Аб“яўляўся бэнэфіс аркестры з ангельскім назовам «The Song Jazz», што можна перакласьці як сьпеўны джаз.

3. Журналіста Рапалас Мацконіс дае такое параўнаньне «Зялёнага Штраля» з «Чырвоным»: «На той самай вуліцы, падобная вялікая заля, з багатым буфэтам. Сьцены пафарбаваныя зялёным – адсюль назоў кавярні». Супастаўляючы наяўныя да- й паваенныя фотаздымкі ды сьведчаньні, можна меркаваць, што «Зялёны Штраль» займаў прастору ў правым, меншым крыле комплексу, уздоўж тунэля пад цяперашнім двухпавярховікам Mažasis teatras («Малога тэатру») й адпаведна вокны цукерні выходзілі ў сярэдні ўнутраны двор і ўласна на вуліцу Міцкевіча. Цяпер гэты пункт пазначаецца, як праспэкт Гедыміна 24.

Музычнае начыньне «Зялёнага Штраля» натуральна зьмянялася згодна з павевамі моды. Працытую пару слупкоў зь вершаванага цыклю «Падарожжа» Міхася Машары: «Вакно адчынена... Я бачу / Тлустых аголеных жанчын. / Няшчыры сьмех... Джазбанд зьвінячы... / З юрлівым рогатам мужчын. / І заля пышна так прыбрана: / каўры, крыштал і серабро... / А колькі красак растаптаных / Тут умірае, - пад сталом!»

Віктар Сямашка – музыка, паэта, дасьледчык. Нарадзіўся ў 1980 годзе ў Менску. Зь 2005-га лідэр авант-джазавага гурту Fantastic Swimmers, фанаграфія якога налічвае болей 50 рэлізаў. Зь 2006-га выдаў 5 пяць паэтычных зборнікаў. Быў сябрам Саюзу беларускіх пісьменнікаў да яго расфармаваньня. Зь 2010-га вядзе музычна-аналітычную праграму "Кракатук" на "Беларускім Радыё Рацыя". Стаў аўтарам дасьледаваньняў у гісторыі беларускага джазу і авангарду, андэрграйндзе 1960-70-ых, айчыннай музыцы XXI ст. ды іншых тэмах. Цяпер вывучае джазавую й беларускую прысутнасьць у Вільні 1920-30 гг.

ЛЕКЦЫЯ

“Партызанскі міф” Беларусі: на сутыку гісторыі, ідэалогіі і антрапалогіі

Уладзімір Лобач

Незалежны даследчык

Мэтай прапанавага даследавання ёсць параўнальны аналіз базавых канцэптаў, якія вызначаюць “партызанскі міф” Беларусі ў працах прафесійных гісторыкаў, у ідэалагічных і прапагандысцкіх рэпрэзентацыях і ў народнай візіі, акумуляванай ва ўспамінах сведкаў вайны. Параўноўваюцца “генеральныя сюжэтныя лініі” прафесійных і народных наратываў пра партызанаў і выяўляюцца лакуны у тэкставым палатне кніжнай гісторыі, якія вельмі ёміста прадстаўлены ў “гісторыі знізу”. Значны досвед палявых даследаванняў, у выніку якіх быў сабраны вялікі аб’ём успамінаў беларускіх вяскоўцаў пра вайну і нацысцкую акупацыю, а таксама задзел у тэарэтычным асэнсаванні антрапалогіі вайны дазваляюць правесці кваліфікаванае прафесійнае даследаванне ў рамках пазначанай тэмы. Папярэднія высновы палягаюць у тым, што ні савецкая (постсавецкая) візія партызанскага руху, ні яе апазіцыйная “дэмакратычная” рэвізія не адпавядаюць у поўнай ступені вясковаму ўспрыняццю вайны, дзе апошняя бачыцца куды больш складанай з’явай, чым гэта прынята ў прафесійнай гістарыяграфіі. Гэтая

неадназначнасць датычыцца і ацэнкі партызанскага руху, якая ў рамках лакальных вясковых супольнасцяў заўжды адбывалася прадметна, без шырокіх абагульненняў.

Беларускі гісторык, этнограф, фальклярыст, доктар гістарычных навук. У 1994 годзе скончыў гістфак Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, пасля чаго стаў працаваць у Полацкім дзяржаўным універсітэце. У 2003 абараніў кандыдацкую, а ў 2017 – доктарскую дысертацыю, якія былі прысвечаны міфасемантыцы беларускай традыцыйнай культуры. З 2019 года – прафесар кафедры гісторыі і турызму гуманітарнага факультэта Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. У красавіку 2021 г. звольнены па палітычных прычынах. На сённяшні дзень праводжу навуковыя даследаванні ў Польшчы, у супрацы з рознымі навуковымі інстытуцыямі Цэнтральнай Еўропы.

Актывісцкія практыкі як сродак стварэння гарадской спадчыны: графіці, перформансы, вулічныя фестывалі.

Дар'я Буяла

ЕГУ

Сучасныя дыскусіі аб культурнай спадчыне адзначаюць зрух ва ўспрыманні горада як прасторы, дзе гісторыя і памяць перастаюць належаць манапольным інстытуцыям і экспертам з прафесійных супольнасцяў, а часцей аказваюцца вынікам дзеянняў разнастайных акцёраў: жыхароў гарадоў, мастакоў, актывістаў, лакальных супольнасцяў. Дадзены зрух, пазначаецца ў даследаваннях як пераход ад "аўтарызаванага дыскурсу спадчыны" (Лараджэйн Сміт) да множных, часта канфліктуючых паміж сабой формаў "вытворчасці спадчыны знізу". Напрыклад з'яўленне новых форм мастацтва: графіці, перформансы, рэйв-акцыі, часовыя фестывалі, лакальныя інтэрвенцыі ў гарадское асяроддзе. У гэтых зменах можна ўбачыць пашырэнне катэгорый спадчыны, але і перараз мерkаванне ўлады паміж афіцыйнымі структурамі і нефармальнымі ініцыятывамі.

Актывістка і праектная мэнэджарка. Жыве ў Вільнюсе і навучаецца ў магістратуры Еўрапейскага Гуманітранага ўніверсітэта, дзе даследуе артывізм, фармаванне гарадской спадчыны ў кантэксце сусветнай палітыкі і альтэрнатыўныя офрмы спадчыны. Таксама займаецца квір і фем актывізмам, правядзеннем адукацыйных мерапрыемстваў, лекцый і з'яўляецца моладзевым працаўніком.

ПАНЭЛЯ 7. КАНОНЫ Ў ВЕРНАКУЛЯРНЫХ ПРАКТЫКАХ

Нефармальныя архівы Брэста: Visit Brest, Brest Herstory і новыя практыкі культурнай памяці

Аліна Дзеравянка
ЕГУ

Даклад будзе прысвечаны праектам Visit Brest і Brest HERstory — незалежным ініцыятывам, якія даследуюць гарадскую прастору Брэста праз відэа, лакальную і жаночыя гісторыі. Праекты ўзніклі як спроба стварэння альтэрнатыўнага вобразу горада паза афіцыйнымі турыстычнымі і дзяржаўнымі наратывамі пасля закрыцця арганізацыі «Фонд развіцця Брэсцкай крэпасці» і ”Прасторы КХ”. Асноўная ўвага будзе прысвечана таму, як digital storytelling і відэа падыходы могуць працаваць як інструменты пераасэнсавання культурнай памяці і лакальнай ідэнтычнасці. Праекты даследуюць, якім чынам гісторыя, архітэктура, нефармальныя маршруты і нябачныя раней гісторыі становяцца часткай новага культурнага канону.

У дакладзе будуць закранутыя наступныя пытанні:

- роля незалежных культурных ініцыятыў у працы з памяццю;
- YouTube і сацыяльныя медыя як новыя архівы лакальнай спадчыны;
- жаночыя гісторыі як спосаб пераасэнсавання гарадской гісторыі. Даклад будзе грунтавацца на практычным досведзе стварэння ініцыятыў Visit Brest і Brest HERstory у Брэсце.

Аліна Дзеравянка - культурная менеджарка, куратарка, даследчыца і актывістка з Брэста. З 2010 года працую на скрыжаванні сучаснага мастацтва, культурнай спадчыны і сацыяльна ангажаваных культурных практык. Была дырэктаркай Фонду развіцця Брэсцкай крэпасці (2013–2022), а таксама каардынатаркай міжнародных культурных праектаў і даследаванняў. У апошнія гады працавала над незалежнымі праектамі Visit Brest і Brest Herstory, прысвечанымі даследаванню гарадской прасторы Брэста праз відэа, лакальную гісторыю і жаночыя гісторыі.

Скончыла магістратуру па культурным менеджменце Маскоўскай вышэйшай школы сацыяльных і эканамічных навук (MSSES) і магістратуру па параўнальнай гісторыі Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта (Вільня). Выкладаю ў Еўрапейскім гуманітарным ўніверсітэце.

ПАНЭЛЯ 7. КАНОНЫ Ў ЕРНАКУЛЯРНЫХПРАКТЫКАХ

kalyska.archive. сямейныя ўспаміны, як частка агульнай культуры памяці

Сяргей Кавалёў
Незалежны даследнік | kalyska.archive

kalyska.archive — незалежная ініцыятыва, прысвечаная захаванню, алічбоўцы, рэстаўрацыі і кантэкстуалізацыі хатніх фільмаў і сямейных аўдыёвізуальных архіваў. Праект працуе з прыватнымі кіна- і відэаматэрыяламі, разглядаючы іх не толькі як асабістыя ўспаміны, але і як важную частку культуры і паўсядзённага жыцця беларусаў.

Ініцыятыва ўзнікла ў адказ на хуткае знікненне аналагавых сямейных архіваў і адсутнасць інстытуцыйных структур для захавання неафіцыйнай аўдыёвізуальнай памяці ў Беларусі. За апошні год kalyska.archive алічбаваў больш за 120 гадзін матэрыялаў

ад 13 сем'яў-донараў з Беларусі, Польшчай, Іспаніі і Расіі, адначасова наладжваючы партнёрскія стасункі з міжнароднымі архіўнымі ўстановамі і прафесійнымі кінастудыямі.

Праект даследуе хатнія фільмы як далікатную форму калектыўнай памяці, якая месціцца на сутыку асабістага досведу і публічнай гісторыі. Яго праца спалучае архіўную практыку, адукацыю, даследаванні і стварэнне супольнасці.

Ініцыятыва мае на мэце стаць устойлівай інфраструктурай для сямейнай аўдыёвізуальнай спадчыны Беларусі і платформай для супрацоўніцтва паміж сем'ямі, даследчыкамі, мастакамі, архівістамі і дыяспарнымі супольнасцямі. kalyska.archive мае на мэце пашырэнне ведаў пра тое, што паўсядзённае жыццё, побытавыя абрады і аматарскія запісы з'яўляюцца важнымі гістарычнымі сведчаннямі, якія заслугоўваюць прафесійнай увагі і доўгатэрміновага захавання.

Артыст, даследчык, куратар, рэжысёр. Заснавальнік kalyska.archive, ініцыятывы, прысвечанай захаванню аўдыёвізуальнай памяці беларускіх сем'яў. Чалец Беларускай Незалежнай Кінаакадэміі і асацыяцыі INEDITS. Маю 15 гадоў досведу ў галіне аўдыёвізуальнай спадчыны, дакументальнага кіно, медыяпрадукцыі і працы з аматарскімі і хатнімі архівамі. Мая практыка сканцэнтравана на прыватнай памяці, паўсядзённым жыцці і тым, як сямейныя матэрыялы могуць стаць часткай публічнай культурнай гісторыі. Стыпендыят праграмы Gaude Polonia, Martin Roth-Initiative і Prince Claus Fund. Удзельнік кінафестываляў Berlinale 2025/2026, DOK Lepzig 2023, выставы Natureza Urbana 2024 (Бразілія). Працую над інтэграцыяй беларускіх сямейных калекцый у міжнародныя даследчыя і архіўныя сеткі.

Электронны гід "Міжваенны татарскі маршрут па Вільні"

Ангеліна Б., Андрэй Л.
Незалежныя даследчыкі

Despite Vilnius's multicultural history and its close connection to the history of the Tatars, the Tatar component of the city's cultural landscape is remains weakly visualised and insufficiently integrated into contemporary narratives of public memory.

In the urban space there are few clear simbolic markers of the historical presence of the Tatar community, resulting in a loss of cultural depth and polyphony of the spirit of place, the dominance of selective historical narratives and a reduced potencial for intercultural dialogue.

According to the concept of the cultural landscape, European Landscape Convention and the Québec Declaration on the preservation of the Spirit of Place, Spirit of Place understands as a complex of tangible and intangible elements that shape local identity. Insufficient recognition of Tatar heritage within this complex not only skews the historical image of Vilnius, but also limits the possibilities for cultural interpretation and revitalization.

In the 20th century, when Vilnius was part of an interwar Poland, the city became the capital of Tatar cultural and religious revival. It was here, where muftiate and museum operated, scholarly researches were conducted, magazines were published. During this period, despite their relatively small numbers, Tatars made a strong mark, reminding to others of their presence. This study employs a multidisciplinary methodology combining historical-archival analysis, cultural landscape analysis and digital heritage mapping. During

historical-archival analysis we referred to archival documents, photographs and periodicals related to the Tatar's social, cultural and religious activities. During cultural landscape analysis we applied concepts of „cultural landscape" and „spirit of place" to identify tangible and intangible components of Tatar heritage. To conclude the results of the research we turned to digital heritage mapping and created publicly available interactive map to visualize sites and narratives associated with Tatar heritage in Vilnius.

In our research we show that, although Tatars played a significant role in social, cultural, and religious life of Vilnius, their presence in contemporary urban space poorly represented. This imbalance contributes to fragmented understanding of multicultural identity of a city and limits the potential for forming intercultural dialogue and inclusive heritage policy. As a practical outcome of the project, we created a virtual interactive map and a cultural route dedicated to Tatar heritage in the interwar Vilnius, accompanied by an audio guide. These digital tools aim to raise awareness of underrepresented heritage in Vilnius, introduce new narratives into cultural discourse, and propose new ways to attract youth and city visitors. The research concludes that integrating marginalized ethnocultural layers into the urban landscape enriches the spirit of place and supports a more inclusive interpretation of Vilnius's past.

Ангеліна - студэнтка бакалаўрскай праграмы «Еўрапейская спадчына і крэатыўны турызм». Пачынаючая культурная менеджарка, на працягу трох гадоў займаецца распрацоўкай і кураторствам праектаў. Інтарэсы: вывучэнне фарматаў і метадаў працы з інклюзіўнымі супольнасцямі: дзеці, мігранты, этнічныя суполкі.

Андрэй - студэнт бакалаўрскай праграмы «Еўрапейская спадчына і крэатыўны турызм». Даследчык культурнай спадчыны татараў на тэрыторыі Літвы і Беларусі. Навуковыя інтарэсы: гісторыя, антрапалогія, нацыянальныя меншасці, практыкі па актуалізацыі культурнай спадчыны.

ПАНЭЛЯ 8. РУКА НА ПУЛЬСЕ. КАНОНЫ БУДУЧЫНІ

Методология как беларусская theory of change: игра, отложенное будущее и практики настоящего

Анастасия Сташкевич

Независимая исследовательница

После 2020 года беларусское демократическое движение оказалось в ситуации, которую можно описать как режим отложенных изменений. Образы будущей Беларуси продолжают активно производиться через стратегии перехода, программы реформ, экспертные документы, образовательные инициативы и публичные дискуссии о демократических ценностях. Однако возможность реализации этих проектов сегодня внутри страны остаётся невозможной и зависит от события, находящегося вне прямого контроля самих демократических акторов: кризиса режима, транзита власти, открытия политического окна возможностей. В результате настоящее начинает восприниматься как пауза перед «настоящей политикой», как время подготовки, ожидания и сохранения готовности.

Доклад предлагает теоретически осмыслить эту ситуацию через обращение к методологическому движению как к одной из локальных интеллектуальных традиций, которая из философского движения смогла трансформироваться в аутентичную для беларусского контекста theory of change. В беларусской интеллектуальной истории

она сыграла особую роль: стала способом мыслить действие в условиях ограниченной политической субъектности, идеологического давления и невозможности прямого участия в принятии решений.

Методологическое движение возникло как альтернатива советской официальной философии, прежде всего в пространстве теории познания, истории и методологии науки. На первый взгляд, это был неполитический, почти кабинетный интеллектуальный круг, сосредоточенный на вопросах науки, техники, мышления и организации деятельности. Однако именно эта «непрямая» форма позволила методологии выйти за пределы академической философии и стать практикой работы с будущим. После распада СССР методологическая традиция разошлась по разным постсоветским траекториям: в России она была встроена в сферы стратегического управления, промышленной политики, образования, консалтинга и подготовки кадров; в Беларуси — оказалась связана с гражданским обществом, образовательными проектами, демократическим движением и независимой интеллектуальной средой.

Главный вопрос доклада: что обеспечило такой деятельностный успех методологии? Мой тезис состоит в том, что её сила заключалась не столько в содержании конкретных философских схем, сколько в формате работы. Методология стала коллективной формой проблематизации настоящего. Она предлагала форму работы над сложными процессами: распределение позиций, удерживание разных перспектив, построение схем и проектирование возможных действия. В условиях, когда «серьёзные» политические решения были невозможны или недоступны, методологи предложили игру — особую форму совместного мышления, в которой участники могли пережить ограниченный, но ощутимый результат.

Доклад вводит понятие малой результативности. Под ним понимается не немедленное изменение институтов или политического режима, а опыт действия, в котором участники получают общий язык проблематизации, чувство принадлежности к группе и способность проектировать возможные шаги.

Именно поэтому методология может быть рассмотрена как аутентичная для беларусского опыта theory of change. Она создавала формы субъектности в условиях несвободы. Она учила не только описывать будущее, но и практически работать с неопределённостью, конфликтом, невозможностью и ожиданием.

Теоретическая гипотеза доклада состоит в том, что в условиях отложенной политики продуктивность языка будущего определяется не только убедительностью образа желаемой Беларуси, но и тем, способен ли этот язык предложить способ действия в настоящем. Если большой политический результат отложен, гражданская субъектность поддерживается через практики малой результативности: безопасные, понятные, коллективные формы участия, в которых человек видит эффект своих действий уже сейчас.

Таким образом, методологическая традиция важна как часть беларусской интеллектуальной культуры, которая сегодня может помочь поставить вопрос о том, как возможна проблематизация как практика настоящего в условиях ограниченной политической субъектности беларусского гражданского общества.

Я магистр философии, исследовательница и организаторка культурно-образовательных проектов. Окончила Факультет философии и социальных наук Белорусского государственного университета. Тема моей магистерской диссертации — «Становление концепта власти во французской философии XX века». Мои научные интересы нахо-

дятся на пересечении философии, истории идей, социологии знания, политической теории и беларусских интеллектуальных традиций. Темы моих научных статей касались вопросов субъективности, проблематизации и свободы в контексте философии Мишеля Фуко. Я работала младшей научной сотрудницей в Институте социологии НАН Беларуси, где также училась в аспирантуре, однако не завершила обучение из-за вынужденного отъезда из Беларуси. Сейчас в Варшаве я развиваю философский клуб Noctes, где провожу лекции, медленные чтения, литературные встречи и кинодискуссии. В текущих исследованиях обращаюсь к методологическому движению как к локальной беларусской theory of change.

ПАНЭЛЯ 8. РУКА НА ПУЛЬСЕ. КАНОНЫ БУДУЧЫНІ

Экалагічны дыскурс культурнай спадчыны

Таццяна Кузняцова

ЕГУ

Даклад прысвечаны пераасэнсаванню спадчыны ў эпоху Антрапацэну. Па-першае, будзе разгледжана, як экалагічныя змены навакольнага асяроддзя сёння ўплываюць на культурную спадчыну, а таксама якую ролю культурная спадчына (асабліва нематэрыяльная) можа адыгрываць у захаванні прыродных тэрыторый. Па-другое, будзе праналізавана кола праблем і выклікаў, якія ўзнікаюць у выніку падзелу прафесійных сфер культурнай і прыроднай спадчыны. Па-трэцяе, будуць прадстаўлены асноўныя тэарэтычныя напрамкі крытычных падыходаў да працы са спадчынай, звязаных з выклікамі Антрапацэну. Сярод іх — перспектыва экалагічнай справядлівасці, уключэнне не-чалавечых суб'ектаў, а таксама пераход ад «кансервацыі спадчыны» да «кіраванага распаду» (curated decay). Падчас выступу будуць таксама прадстаўлены асноўныя ідэі і індыкатары «экалагічнага дыскурсу спадчыны», які сёння фарміруецца як у акадэмічнай сферы, так і ў практыках працы са спадчынай.

Mgr. Tatsiana Kuzniatsova is a Belarusian environmentalist and researcher (MA in Cultural Heritage, European Humanities University) based in Vilnius, Lithuania. Her research interests include environmental approaches to heritage, post-anthropocentric studies, the more-than-human heritage perspective, gender and environmental justice. She is a lecturer of the course "Landscape, Place, Cultural Environment" in the BA programme "Cultural Heritage and Creative Tourism" at the European Humanities University.

Беларускі тэатр 2020-х гадоў у кантэксце трансфармацыі культурных канонаў: ад інстытуцыйнай крытыкі да блогерскага дыскурсу

Настасся Панкратава

Вольны даследчык, the Independent Additional Councilor UNIMA

У Беларусі цягам апошніх дзесяцігоддзяў панавала два кананічных напрамкі даследавання і фіксацыі тэатральнага мастацтва: тэатразнаўства як навука, якая вывучае гісторыю і тэорыю тэатра, і тэатральная журналістыка. Апошні тэрмін у нулявыя годы ўвяла прафесар Таццяна Арлова. Яна вызначыла тэатральную журналістыку як «у адных выпадках — усе матэрыялы СМІ, якія тычацца тэмы тэатра. У іншых выпадках яна з'яўляецца спецыфічнай формай літаратурна-мастацкай крытыкі». Менавіта прадстаўнікамі абодвух бакоў складаўся той корпус тэкстаў, на аснове якога адбывалася вывучэнне і даследаванне нацыянальнага тэатральнага мастацтва. Тут узгадаем яшчэ адно выказванне Таццяны Арловай пра тое, што «усе лепшыя тэатразнаўчыя працы былі створаныя на аснове газетна-часопісных артыкулаў».

У 2020-я гады адбылася істотная трансфармацыя механізмаў фіксацыі і інтэрпрэтацыі падзей у беларускім тэатральным працэсе. Адметнай рысай гэтага перыяду стала ўзмацненне ролі блогераў, якія паступова занялі ключавыя пазіцыі ў асвятленні сучаснага тэатра. Асабліва выразна дадзеная тэндэнцыя выявілася ў 2025 годзе, калі буйныя дзяржаўныя тэатральныя фестывалі, у прыватнасці "Белая Вежа", афіцыйна пачалі запрашаць да асвятлення форумаў "журналістаў і блогераў". Як бачым, тэатразнаўцы выпалі з полю прыярытэтаў тэатральнай супольнасці.

Радыкальная змена роляў паміж прафесійнай тэатральнай крытыкай і новымі медыйнымі суб'ектамі была абумоўлена комплексам сацыяльна-культурных трансфармацый, каталізатарам якіх сталі падзеі 2020 года. Менавіта пасля гэтага перыяду ў тэатразнаўстве і тэатральнай крытыцы назіраецца маштабнае перафарматаванне прафесійнага поля.

Яго характэрнай рысай стала маштабнае выкрэсліванне дзеячаў з гісторыі айчыннага мастацтва, што закранула і тэатразнаўства. З Акадэміі мастацтваў сышлі навукоўцы, чые імёны і даследванні ў 10-х гадах стала з'яўляліся як у спецыялізаваных часопісах, так і ў СМІ. У беларускіх медыях таксама паказальна змяніўся склад крытыкаў, якія займаліся тэатральнай журналістыкай: у першай палове 20-х гадоў са старонак перыёдыкі зніклі многія аўтарытэтныя прозвішчы, бо кагосьці проста перасталі публікаваць, некаторым давялося з'ехаць за мяжу. Тыя, хто змог працягнуць сваю дзейнасць унутры Беларусі, пачалі пісаць больш асцярожна, засяроджваючыся збольшага на пазітыўных момантах, бо крытыкаваць пэўныя асобы ці тэатры сёння небяспечна для самаго эксперта.

У выніку прафесійнае тэатразнаўства ў значнай ступені страціла здольнасць задавальняць запыт аўдыторыі на незалежную і аргументаваную экспертную ацэнку. На гэтым фоне блогеры апынуліся ў больш выгаднай пазіцыі: адсутнасць жорсткай уключанасці ў дзяржаўныя акадэмічныя і медыйныя структуры дазволіла ім больш свабодна асвятляць тэатральны працэс, прыходзіць на любыя спектаклі, ладзіць творчыя сустрэчы з запатрабаванымі рэжысёрамі і мастакамі. Дзякуючы актыўнаму выкарыстанню візуальнага кантэнта, што само па сабе больш прывабна для сучаснай аўдыторыі,

і аператыўнасці блогеры сталі важным элементам сённяшняй сістэмы папулярызацыі тэатральнага мастацтва.

Такім чынам, блогерская дзейнасць у пэўнай ступені закрывае тыя белыя плямы, што ўзніклі ў айчынным тэатразнаўчым полі ў першай палове 2020-х гадоў. Аднак перанос цэнтру ўвагі з прафесійнага аналізу на эмацыйную і суб'ектыўную ацэнку спектакляў стварае шэраг рызык для развіцця нацыянальнага тэатральнага дыскурсу. У дадзеных умовах адбываецца паступовае змяшчэнне рэфлексіі пра тэатр з прафесійнай крытычнай сферы ў прастору аматарскай медыйнай інтэрпрэтацыі, што можа прывесці да дэвальвацыі экспертнага падыходу і размывання крытэрыяў мастацкай ацэнкі.

Настасся Панкратава, тэатральны крытык, журналістка. Скончыла журфак БДУ (2006). Была загадчыцай літаратурнай часткі ў Беларускім дзяржаўным тэатры лялек. 11 гадоў працавала ў рэспубліканскай газеце "Культура". Таксама публікавалася ў часопісе "Мастацтва", на парталах TUT.BY і Onliner, уваходзіла у склад крытыкаў у праекце "Тэатральная Беларусь". Уладальніца дыплома UNESCO.

У 2020-2021 годзе працавала на TUT.BY. З 2022 года знаходзіцца ў Літве. Выступае эксперткай у медыя і для айчынных і замежных культурных арганізацый і ініцыятыў, на навуковых канферэнцыях, рэцензенткай выпускных прац тэатральнага аддзялення ЕГУ. З'яўляецца Additional Councilor пры Міжнародным саюзе лялечнікаў UNIMA па пытаннях Беларусі, рыхтуе артыкулы для World Encyclopedia of Puppetry Arts. У 2026 годзе ў выдавецтве Skaryna Press выдала кнігу „(Не) выкраслены: Беларускі тэатр 2015–2025. Выбраныя старонкі".

ПАНЭЛЯ 8. РУКА НА ПУЛЬСЕ. КАНОНЫ БУДУЧЫНІ

Музеефікацыя блізкай гісторыі – актуальныя практыкі і метадалагічныя выклікі

Аляксей Бацюкоў

Музей Вольнай Беларусі

Актуальны стан і выклікі, звязаныя з працэсам музеефікацыі артэфактаў сучаснасці і блізкай гісторыі. Праблемы метадалогіі, кампаратывісцкае вывучэнне пашыраных і непашыраных практык.

Аляксей Бацюкоў (нар. 01.08.1977 у Магілёве) — беларускі эсэіст, журналіст, пісьменнік. Скончыў гістарычны факультэт Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэту імя Аркадзя Куляшова, аспірантуру БДУ. Працаваў на магілёўскай абласной тэлевізіі, старшым выкладчыкам Беларуска-Расейскага ўніверсітэту, дырэктарам Музея гісторыі Магілёва.

Ці састарэла спадчына? Так!

ЛЕКЦЫЯ

Сцяпан Стурэйка
ЕГУ

Калі мы разважаем пра канон беларускай культурнай спадчыны, то мы якую спадчыну маем на ўвазе? Бо існуе як мінімум тры яе канцэпцыі, арыентаваных на нацыянальнае, глабальнае і сацыяльнае. Больш за тое, сёння на нашых вачах нараджаецца чацьвертая, арыентаваная на экалагічнае. Усе яны ўяўляюць сабой дастаткова герметычныя комплексы з унутраным драматызмам і з'яўляюцца прамымі адказамі на сацыяльна-палітычныя патрасенні Еўропы і свету. Аднак трагікамічнасць сітуацыі палягае ў тым, што яны не замяшчаюць адна адну, а суіснуюць, ствараючы мудрагелісты вэрхал у галовах суайчыннікаў, якія спрабуюць даваць свае далёка не заўсёды дарэчныя адказы на сучасныя выклікі. Дык якое ж нашае месца ў гэтым калейдаскопе і які канон спатрэбіцца вызначаць неўзабаве? Адказ прагучыць на лекцыі.

Дацэнт, PhD

Upływu palityki na kanony biełaruskaj kultury u XX st. i na paczatku XXI st.

ЛЕКЦЫЯ

Алена Глагоўская
Uniwersytet Kazimierza Wielkiego w Bydgoszczy, profesor

Można pryniać, szto kultura kožnaj nacyi razvivajecca samastojna, ale niezależna ad samastojnaha razvićcia karektury u jaje uvodzić dziarżaunaja palityka. Kali idzie pra biełaruskuju kulturu, na praciahu XX st. można nazirac, jak jana ad naszaniuskaha czasu razvivalasia, spiarsza va u movach rasiejskaj imepryi, na chwali liberalizacyi 1905 h. Rost nacyjanalnaj świedamaści i nacyjanalnaj kultury (F. Bahuszewicz, Ciotka, J. Kupała, J. Kołas, M. Bahdanovicz) u hh. 1906-1918 daviou da abviaszczennia niezależnaśći BNR, jakaja miełasia stacca suczasnaj niezależnaj biełaruskaj dziarżavaj. Nażal tak nie stałasia. Wynik I susvietnaj vajny upichnuu biełaruskuju kulturu u prastoru savieckaj dziarżaunaści BSSR i polskaj dziarżaunaści. Z adnaho boku u BSSR kultura padparadkouvalasia palitycy biełarusizacyi i idealahizacyi nacyjanalnaj pa formie i praletariackaj pa zmieście, szto u 30. hh. daviało do jaje zaniapadu. Z druhoha boku - u Polszczy biełaruskaja kultura była zviedziena da pryvatnaha raviccia, dziela czaho nie chapała srodkau, ale tut naradziałasia tzv. "zachodniabiełaruskaja" kultura. Paśla II susvietnaj vajny u BSSR idealahizacyja kultury zvodziłasia da mifalahizacji savieckaj partyzantki i jaje roli u vyzvalenni BSSR spad niamieckaj akupacyi. Heta davało da taho, szto nacyjanalnaja kultura davajennaha czasu pajszła u adstauku - treba było bzabycca pra tvorczaść Franciszka Alachnovicza, Kazimira Svajaka, Chviedara Iljaszevicza i druhich. Tolki nacyjanalnaje adradzeńnie u kancy 80. i paustannie suverennaj Respubliki Biełaruś viartała z zabyćcia autarau i ich tvory.

Naradziłasia 8.04.1959 h. u Jaryłaucy na Biełastocczynie, zakonczyła paczatkovuju szkołu u Babrounikach (1974), ahulnaadukacyjny licej u Michałowie (1978), Fakultet Żurnalistyki i Palitycznych Nawuk Warszauskaha Uniwersyteta (1983), pracavała wykładczykam na Uniwersytecie Gdańskim (1984-1998), na Katedry Biełaruskaj Kultury Uniwersyteta u Biełastoku (1998-2014), u Vyszejszaj Szkole Ekanomii i Infarmatyki u Olsztynie (2014-2017), z 2017 h.

na Uniwersytecie Kazimierza Wielkiego w Bydgoszczy. Autarka knih "Białoruś 1914-1929. Kultura pod presją polityki" (Białystok 1996), "Białorusini na Wybrzeżu Gdańskim" (Toruń 2003), "Od Imperium Rosyjskiego do Unii Europejskiej. Stosunki polsko-białoruskie w XX wieku" (Białystok 2012), "Za Białorusią świata nie wiedział". Rzecz o Teodorze Iljaszewiczu - białoruskim poecie, historyku i działaczu" (Białystok 2021) i kala. 700 artykułów.

Імянны паказьнік

Leahy
Emma Louise, 32

Іваноў
Уладзіслаў, 31
Архіпенка
Андрэй, 11
Арцімовіч
Таня, 22
Б.
Ангеліна, Л.
Андрэй, 37
Бацюкоў
Аляксей, 42
Буяла
Дар’я, 35
Валанцэвіч
Наталля, 11
Вячорка
Вінцук, 15
Глагоўская
Алена, 43
Гушчынскі
Ігар, 12
Дзеравянка
Аліна, 36
Забела
Раман, 13
Захаркевіч
Сцяпан, 31
Зданевич
Наталья, 19
Кавалёў
Сяргей, 36
Казлоўская
Марына, 6
Карпенкіна
Яніна, 29
Князева
Ксенія, 4
Колас
Радзівон, 8
Красулін
Яўген, 20
Крыцук
Раман, 27
Кузняцова
Таццяна, 40
Кур’яновіч
Паліна, 9
Лабачэўская
Вольга, 30
Ластоўскі
Аляксей, 10
Лобач
Уладзімір, 34
Мацкевіч
Тамара, 3
П.
К., 21
Панкратава
Настасся, 41
Пашковіч
Вольга, 2
Петренко-Цеунова
Ольга, 17
Розін
Яўген, 24
Розіна
Кацярына, 23
Скурко
Андрэй, 16
Сташкевич
Анастасия, 38

Стурэйка
Сцяпан, 43
Сямашка
Віктар, 33
Сідаровіч
Марына, 7
Тушынскі
Дзяніс, 1
Харэўскі
Сяргей, 10
Чарнаморцава
Валерыя, 25

культура у палоне мінулага

міждысцыплінарная

навуковая

канфэрэнцыя

пры падтрымцы Scholars for Belarus by akno e.V.

віленскі беларускі музэй імя івана луцкевіча

ВІЛЬНЯ 11-13 ЧЭРВЕНЯ 2026